ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Панядзелак, 10 студзеня 1938 г., № 2 (344).

Цана 20 кап

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення ССПБ і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР



СУПРОЦЬ ФАРМАЛІЗМА У МАСТАЦТВЕ

На старонках газеты «Праўда» зноў узнята пытанне барацьбы з фармалізмам. Аб'ектам крытыкі з'явіўся тэатр імя Мейерхольда. Гэта выклікана тым, што тэатр гэты разам са сваім кіраўніком Мейерхольдам на семнаццатым годзе існавання абанкроціўся. Ён адарваўся ад савецкай рэчаіснасці, згубіў свайго гледача, бо не меў сучаснага рэпертуара, не імкнуўся яго ствараць, а хаваўся за класічнымі п'есамі, якія рэжысёрам Мейерхольдам скажаліся да непазнавальнасці. Усё гэта рабілася невыпадкова.

В. Э. Мейерхольд яшчэ да рэвалюцыі змагаўся супроць рэалістычнага тэатра—за тэатр умоўны, эстэтычны, фармалістычны,—за тэатр, адарваны ад жыцця. Мейерхольд ішоў у той час з той інтэлігенцыяй, якая адурманьвала галовы пролетарыята опіумам містыкі, сімволікі і богашукання. Ён тады змагаўся за паказ не рэальных людзей, а ўмоўных вобразаў, схем, масак. З такім цяжкім грузам фармалізма прышоў Мейерхольд у совецкі тэатр. Упачатку сваёй працы ў тэатры РСФСР ён імкнецца згрупаваць вакол сябе фармалістаў розных кірункаў і разам з імі ўмудраецца выхваліць меншавіцтвуючага здрадніка ў «Зорах» Верхарна і прысвяціць спектакль «Зямля дыбам» Іудзе Троцкаму. За 17 год свайго існавання тэатр імя Мейерхольда паставіў 23 п'есы. Большасць іх—класічныя. Выдатныя тзоры Астроўскага, Гогаля, Грыбаедава, Чэхава і іншых рэжысёрам Мейерхольдам перарабляліся. Фармалістычнай трактоўкай выхалашчваліся, абядняліся і прыніжаліся іх праўдзівыя і глыбокія думкі. Усё гэта рабілася ва ўгоду фармалістычным выкрутасам і на гора акторам, творчы рост якіх заціскаўся.

Совецкі рэпертуар ігнараваўся тэатрам імя Мейерхольда. А калі ўжо прымалі п'есу ў работу, дык ніякаякасную, якая не выкарыстоўвалася ні адным тэатрам Совецкага Саюза. Іншы раз траплялі ў тэатр і добрыя совецкія п'есы, але яны кардынальна перапрацоўваліся ў тыповым мейерхольдаўскім духу, пасля чаго нават аўтар не пазнаваў свайго твора. Мейерхольд, часта матывуючы гэта адсутнасцю совецкага рэпертуара, браў для пастаноўкі п'есы ад варожых нам людзей. Гэта сведчыць аб тым, што тэатр ізаляваў сябе ад совецкай рэчаіснасці, ад яе людзей і ад соцыялістычных падзей. На працягу раду год тэатр імя Мейерхольда пазбягаў раскрыцця вобраза совецкага чалавека—большэвіка, а займаўся рознастайным смакаваннем тыпаў мешчаніна, не паглыбляючыся ў іх соцыяльную сутнасць. Такі шлях тэатра прывадзіў яго да скажэння совецкай рэчаіснасці—тэатр паклёпнічаў на совецкую вёску, Чырвоную Армію, на яго сцэне часам з'яўляліся адкрыта трацкісцкія спектаклі.

Апошнія два з паловай гады ў рэпертуары тэатра зусім адсутнічалі совецкія п'есы. Не гледзячы на тое, што совецкая драматургія ўзбагацілася радам каштоўных драматургічных твораў, Мейерхольд не палічыў патрэбным уключыць у рэпертуар свайго тэатра ні адну з совецкіх п'ес. Вынікам усяго гэтага з'явілася тое, што да 20-годдзя Вялікай соцыялістычнай рэволюцыі тэатр, кіруемы Мейерхольдам, не здолеў паставіць совецкую п'есу, не здолеў рэальна ўвасобіць у сцэнічных вобразах соцыялістычную рэчаіснасць.

Апрача гэтага, у тэатры імя Мейерхольда над калектывам панавала дыктатарства рэжысёра. У гэтым калектыве актору не было магчымасці расці, таму што ён выконваў толькі тое, што яму загадаваў рэжысёр Мейерхольд. Усякая творчая фантазія актора знішчалася рэжысёрскім замыслам. Нават тады, калі тэатр працаваў над класікамі, тзоры Астроўскага ці Гогаля так нявечыў рэжысёр Мейерхольд, што актору, па сутнасці, не заставалася месца ў спектаклі, яму нецікава было працаваць над роллю, бо ўсё жывое і чалавечае ў вобразе замянялася вонкавымі пабракушкамі і фармалістычнымі трукамі. Усё рабілася дзеля таго, каб паказаць вынаходлівасць рэжысёра і каб у кожным выканаўцу глядач бачыў толькі пастаноўшчыка, а не здольнага актора.

Усе гэтыя мастацка-ідэалагічныя парокі цягнулі за сабою цэлы рад унутраных супярэчнасцей, параджалі сярод калектыва групаўшчыну, сямейнасць, заціск самакрытыкі, што шкодзіла ў рабоце і сеяла разлад паміж работнікамі тэатра.

Акторы, рэжысёры, гледачы выказалі правільную думку ў друку, што тэатр гэты трэба расфарміраваць. Але гэтае расфарміраванне павінна паслужыць урокам для ўсіх нашых совецкіх тэатраў і ў прыватнасці для беларускіх тэатраў. Між тым работнікі беларускіх тэатраў нават не абгаварвалі артыкулаў цэнтральнага друку, яны ў пытаннях барацьбы з фармалізмам засталіся ў баку. А ў нас ёсць аб чым пагаварыць.

Яшчэ ў сярэдзіне мінулага года наша газета пісала аб фармалістычным засіллі ў Дзяржаўным яўрэйскім тэатры БССР. Тут дзейнічалі ворагі. Тут ігнараваўся совецкі рэпертуар. Трэба сказаць, што ён і зараз не надта паважаецца. Совецкія п'есы ставяцца без творчага гарэння, без належнай увагі да іх якасці. Тэатр, па сутнасці, да гэтага часу не ўмацаваны мастацкім кіраўніцтвам. Там працягвае працаваць рэжысёр Галаўчынер, за плячыма якога — вялікі груз фармалістычных перажыткаў. Гэтым-жа Галаўчынерам напісана варожая п'еса, якая скажае совецкую рэчаіснасць, паклёпнічае на лепшых людзей краіны советаў. І тое, што паказаў нам Яўрэйскі тэатр зараз, ніколькі не можа задаволіць совецкага гледача. Зноў-такі мы не бачым у рэпертуары гэтага тэатра добраякаснага совецкага спектакля. У рэпертуарным партфелі Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР няма ні адной арыгінальнай п'есы, адлюстроўваючай жыццё і быт рабочых і калгаснікаў-яўрэяў БССР. Тэатр не думае сур'ёзна перабудоўвацца, усе красамоўныя абяцанні на сходах засталіся толькі абяцаннем. Яўрэйскаму тэатру трэба сур'ёзна дапамагчы.

Гаворачы аб фармалізме, нельга абыйсці і Літвінава, які выйшаў таксама з Яўрэйскага тэатра і прынёс фармалістычныя «традыцыі» ў Белдзяржаэстрэатр. Тут ён умудрыўся сказіць рад класічных твораў і няправільна трактаваў тэму Парыжскай Комуны.

У апошнім спектаклі ён разам з Галаўчынерам паклёпнічаў на Парыжскую Комуну.

Трэба пераглядзець спектаклі і ў іншых нашых тэатрах дзеля таго, каб канчаткова знішчыць сляды фармалізма. А рэцыдывы гэтай бязглуздзіцы шмат дзе яшчэ жывуць.

Не ўсё спакойна і на фронце выяўленчага мастацтва.

Апошняя выстаўка, прысвечаная 20-годдзю Кастрычніка, паказала, што сярод беларускіх мастакоў Аксельрод, Малкін, Красоўскі і інш. — не выключэнне, а плынь. Мастакі гэтыя ў сваіх работах намагаюцца скажаць рэчаіснасць і з'яўляюцца прадстаўнікамі фармалізма.

Неабходна праверыць свае творы і беларускім кампазітарам, у асяроддзі якіх таксама знойдуцца прыхільнікі аджыўшага фармалістычнага напрамку.

Барацьба з фармалізмам ёсць барацьба за рэалізм у мастацтве, барацьба за партыйнае мастацтва. Беларускія работнікі мастацтваў павінны абгаварыць пытанне аб фармалізме ў звязку з закрыццём тэатра імя Мейерхольда.

Упраўленню па справах мастацтваў пры СНК БССР неабходна арганізаваць абгаварэнне артыкулаў, змешчаных у цэнтральным друку, аб тэатры імя Мейерхольда. Трэба ўскрыць рэцыдывы мейерхольдаўшчыны ў беларускіх тэатрах, роўна як і ў выяўленчым і музычным мастацтве БССР.

Першая сесія Вярхоўнага Совета СССР

Праз два дні — 12 студзеня 1938 года — першая сесія Вярхоўнага Совета СССР. На гэтай сесіі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт СССР у асобе яго прэзідыума перадасць функцыі цэнтральнай улады новаму дзяржаўнаму органу — Вярхоўнаму Совету СССР, абранаму паводле Сталінскай Канстытуцыі «на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні».

Мінуў толькі год з часу, як была прынята Сталінская Канстытуцыя СССР. За гэты год працоўныя СССР, народы ўсіх нацыянальнасцей, насяляючых краіну соцыялізма, пераканаліся ў тым, якіх велізарных дэмакратычных правоў дабіліся яны сваёй гераічнай барацьбой за пабудову соцыялістычнага грамадства.

Праведзеныя паводле Сталінскай Канстытуцыі выбары ў Вярхоўны Совет СССР далі магчымасць народу, кожнаму грамадзяніну СССР у паасобку ажыццявіць гэтыя правы поўнасцю.

Сотні год працавала перадавая думка чалавецтва над пытаннямі ўдасканалення чалавечага жыцця. У кожную эпоху знаходзіліся людзі, якія прапаноўвалі самыя фантастычныя праекты перабудовы чалавечага грамадства. Над усімі гэтымі праектамі развіваўся сцяг з заваблівымі словамі: свабода, роўнасць і братэрства. Але кожны раз гэтыя праекты разбураліся аб сцяну эксплаатацыі чалавека чалавекам, а сцяг свабоды, роўнасці і братэрства затапляўся ў крыві: яго паглынала бездань, раздзяляўшая людзей на няроўныя, смяротельна варожыя адзін другому групы і класы.

Сотні год марыла чалавецтва аб дэмакратычных свабодах. На розных ступенях развіцця чалавечага грамадства марыў народ аб «хартыях вольнасці», абвяшчаў «дэкларацыі правоў чалавека». Але нідзе і ніколі не былі гэтыя правы дадзены народу актам дзяржаўнай улады, нідзе і ніколі не былі ажыццёўлены хартыі вольнасці. Працоўнае чалавецтва не магло дабіцца іх, пакуль улада знаходзілася ў руках прыгнятальнікаў, у руках эксплаататараў.

Стагоддзі марыла чалавецтва, як аб залатым сваім часе, аб дні, калі сам народ будзе вяршыць свой лёс, вызначаць сваё жыццё. Гэтая мара збылася толькі ў Совецкім Саюзе, у краіне дыктатуры рабочага класа. Яна заваявана рэволюцыйнай барацьбой. Іншых шляхоў да ажыццяўлення гэтай мары няма,—такі вывад робяць сабе ўсе працоўныя і прыгнечаныя народы свету з практыкі рабочага класа і працоўнага сялянства Совецкага Саюза. Толькі рабочыя і сяляне Совецкага Саюза, на чале з партыяй большэвікоў, партыяй Леніна—Сталіна, здабылі сапраўдную дэмакратыю, сапраўдную свабоду, запісаўшы заваяванае і здабытае ў Сталінскай Канстытуцыі.

12 студзеня — дзень, які ўвойдзе ў гісторыю чалавецтва, у гісторыю рэволюцыйнай барацьбы рабочага класа з класам буржуазіі, як дзень трыумфу розуму і працы на адной шостай частцы свету, як дзень магутнага закліку да рэволюцыйнай барацьбы ва ўсім свеце.

Сапраўдныя прадстаўнікі народа, працоўныя розных нацыянальнасцей, рознастайных вытворчых спецыяльнасцей і кваліфікацыі з'едуцца ў сталіцу соцыялістычнай дзяржавы для вырашэння чарговых палітычных і гаспадарчых задач Совецкага Саюза.

Сталевары і машынабудаўнікі, бавоўнаводы і хлебаробы, даследчыкі і канструктары, аграномы і тэхнікі, камбайнеры і трактарысты, лётчыкі і танкісты, інжынеры, вучоныя, брыгадзіры, палітычныя кіраўнікі—мужчыны і жанчыны, маладыя і старыя, партыйныя і беспартыйныя большэвікі з'едуцца для вырашэння дзяржаўных спраў.

Багат наш народ талентамі, багата краіна знатнымі людзьмі. І самых найлепшых з іх выбраў народ сваімі дэпутатамі ў Вярхоўны Совет. Рэдкае прозвішча дэпутата невядома ўсяму шматнацыянальнаму Совецкаму Саюзу, а большасць сваіх дэпутатаў народ ведае ў твар, называе па імю, велічае героямі, сваімі гордымі сокаламі, заслужанымі майстрамі працы, ордэнаносцамі.

Дзе, у якой краіне можна бачыць яшчэ такую карціну?

Нідзе.

Першая сесія Вярхоўнага Совета СССР — гэта трыумф ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, трыумф большэвізма.

Кожны дэпутат едучы на сесію, вязе з сабой гарачую любоў сваіх выбаршчыкаў, усяго свайго народа да правадыра, настаўніка і друга працоўных таварыша Сталіна, пад чыім кіраўніцтвам рабочы клас у саюзе з працоўным сялянствам, узначальваемы партыяй большэвікоў, прышоў да такога шчаслівага дня.

Разам з тым кожны дэпутат, едучы на сесію, вязе з сабой гарачую адданасць сваіх выбаршчыкаў, усяго свайго народа справе комунізма. У сэрцы кожнага дэпутата гараць незгасальным агнём вялікія словы любімага Сталіна аб тым, якім павінен быць палітычны дзеяч краіны соцыялізма, дэпутат народа ў вярхоўны орган дзяржаўнага кіравання краінай.

«Выбаршчыкі, народ павінны патрабаваць ад сваіх дэпутатаў, каб яны заставаліся на вышыні сваіх задач, каб яны ў сваёй рабоце не спускаліся да ўзроўню палітычных абывацеляў, каб яны заставаліся на пасту палітычных дзеячоў ленінскага тыпу, каб яны былі такімі-ж яснымі і пэўнымі дзеячамі, як Ленін, каб яны былі такімі-ж бясстрашнымі ў баю і бязлітаснымі да ворагаў народа, якім быў Ленін, каб яны былі свабодны ад усякай панікі, ад усякага падабенства панікі, калі справа пачынае ўскладняцца і на гарызонце вырысоўваецца якая-небудзь небяспека, каб яны былі гэтак-жа свабодны ад усякага падабенства панікі, як быў свабодны Ленін, каб яны былі гэтак-жа мудры і непаспешлівы пры вырашэнні складаных пытанняў, дзе патрэбна ўсебаковая арыентацыя і ўсебаковы ўлік усіх плюсаў і мінусаў, якім быў Ленін, каб яны былі гэтак-жа праўдзівы і чэсны, якім быў Ленін, каб яны гэтак-жа любілі свой народ, як любіў яго Ленін».

Гэты наказ дэпутатам Вярхоўнага Совета, сфармуляваны таварышам Сталіным, паўтарае за правадыром увесь народ, заклікаючы сваіх абраннікаў выконваць яго, не адступаючыся ні на крок. Кожнага, хто не будзе выконваць яго, хто не апраўдае давер'я народа, народ будзе адклікаць з Вярхоўнага Совета, пазбаўляць дэпутацкіх правоў.

Перад нашай краінай у гэтым годзе стаяць велізарнейшыя задачы. Краіна ўступіла ў трэці дзесятак свайго існавання. З поспехам выкананы дзве сталінскія пяцігодкі соцыялістычнага будаўніцтва, наперадзе яшчэ большыя планы, яшчэ больш велічныя перспектывы.

Для выканання гэтых велізарнейшых задач трэба бязлітасна граміць і выкарчоўваць трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў і шкоднікаў.

Для выканання гэтых велізарнейшых задач патрэбна жалезная воля, арганізатарскі талент, ясны розум і прагнае жаданне перамогі. Усё гэта ёсць у нашых дэпутатаў—лепшых сыноў соцыялістычнай радзімы. З'ехаўшыся на першую сесію Вярхоўнага Совета, яны па-гаспадарску акінуць поглядам сваю велізарнейшую радзіму і вызначаць шляхі далейшага яе развіцця. Яны створаць новыя органы дзяржаўнага кіравання, на чале якіх паставяць лепшых сыноў комуністычнай партыі, лепшых партыйных і непартыйных большэвікоў.

З гэтага дня пачнецца новая эпоха ў развіцці нашай совецкай дзяржаўнасці, эпоха завяршэння пабудовы бяскласавага грамадства.

Няхай жыве выразнік волі народа—Вярхоўны Совет СССР!

Няхай жыве арганізатар перамог народа — вялікая партыя Леніна—Сталіна і яе правадыр — тварэц Канстытуцыі СССР вялікі Сталін!

Анатоль Астрэйка

НАКАЗ ДЭПУТАТУ

Раннем ясным вёска праважала
Сына роднага у шлях-дарогу,
І наказ яму такі давала —
Просты, шчыры, але строгі:

Ты паслом там будзеш ганаровым
Ад калгаснай вёскі, ад граніцы.
Прывітай ад сэрца нашым словам
Нашу родную Маскву-сталіцу.

Нізкі перадай паклон ты бацьку,
Мудраму, як сонца — дарагому,
Ты пра наша раскажы багацце,
Запрасі у госці к нам дадому.

На вялікім сходзе у палацы,
Калі ўбачыш палкаводца Кліма,
Раскажы, як мы вартуем працу
І спакой вялікае радзімы.

На Чырвонай плошчы над грабніцай
Зор крэмлёўскіх вечнае мігценне.
Просім дэпутата пакланіцца
Маўзалею, дзе спіць родны Ленін;

Пакланіцца нізка, аж да долу,
Расказаць яму, чым людзі сталі,
Што вядзе нас к сонцу, светлай долі
Мудры брат яго — вялікі Сталін.

Менск. 8.1.1938.

ВЫСТАЎКА Ў ГОНАР 20-ГОДДЗЯ РСЧА

Да 20 гадавіны РСЧА у Маскве адкрываецца вялікая выстаўка выяўленчага мастацтва, прысвечаная гераічнай Чырвонай Арміі. Каля 300 мастакоў працуюць па заказах выставачнага камітэта.

У выставачны камітэт, апрача прадстаўнікоў Наркамата абароны, уваходзяць заслужаныя дзеячы мастацтваў: І. Бродскі, А. Герасімаў, С. Герасімаў, І. Паўлаў, В. Сварог, Е. Кацман, мастакі Б. Іогансон, Г. Ражскі, Кукрыніксы, скульптар І. Шадр і іншыя.

Выстаўка адлюструе гісторыю нараджэння Чырвонай Арміі, выдатную ролю В. І. Леніна, таварышоў Сталіна і Варашылава ў яе арганізацыі і перамогах. Яна пакажа грамадзянскую вайну, рэканструкцыю і зснашчэнне арміі, культуру, быт, вучобу, ахову граніц.

Вялікі аддзел будзе прысвечан мастацкай самадзейнасці — творам байцоў РСЧА, якія прымаюць удзел у выстаўцы разам з прафесіянальнымі мастакамі.

1878 НІКАЛАЙ АЛЯКСЕЕВІЧ НЕКРАСАЎ 1938

Н. А. НЕКРАСАЎ

Праф. М. К. ДАБРЫНІН

Лепшыя творы Некрасава прысвечаны мужыку. У непараўнаных вобразах даў ён нам пакутуючага мужыка, які цяжка, да смерці працуе. Некрасаў разумее, што мужыка нельга мераць на панскую мерачку, і падыходзіць да яго не як пан, а як свой-жа мужык-дэмакрат. «Жалезная дарога», «Якім Нагой», «Якаў прыкладны», «Эй! Іван!», «Размышленні ля параднага пад'езда» і шмат іншых твораў ярка, бязлітасна рэальна рысуюць нам мужыка, яго боль, стогн, пакуты, лямант і пратэсты. Некрасаў мала даў вобразаў пратэстуючых мужыкоў, але ўсё-ж яны ёсць. Назавем вобраз Савелія багатыра Святарускага, Кудзеяра.

З выключнай любоўю падаецца Некрасавым жанчына-сялянка. У яе вобразе паэт адлюстраваў жыццё рускай сялянкі.

Три тяжкие доли имела судьба:
И первая доля—с рабом повенчаться,
Вторая—быть матерью сына раба,
А третья—до гроба рабу подчиняться.
И все эти грозные доли легли
На женщину русской земли.

«Мароз, чырвоны нос», «Арына-маці салдацкая», «Каму на Русі жыць добра» (Мар'я Цімафееўна) і шмат іншых твораў даюць комплекс думак, пачуццяў, перажыванняў, сумненняў і спадзяванняў рускай жанчыны, у якой часам адбіралася апошняя радасць.

И погас он словно свеченька
Восковая предыконная...
Мало слов, а горя реченька,
Горя реченька бездонная!..

З вялікай любоўю зарысаваў Некрасаў сялянскіх дзяцей. «Сялянскія дзеці», «Дзед Мазай і зайцы» — даюць нам яскравае ўяўленне, што Некрасаў здолеў і тут адшукаць сваё асаблівае, своеадменнае ў абрысоўцы гэтых вобразаў.

Мужык, сялянка, сялянскія дзеці, іх жыццё, радасць і гора, пакуты і сум, пошукі выйсця і марнасць гэтых пошукаў, злосць і журба, усведамленне бяссілля, гнеў і заклік буры — усё гэта раскрыта Некрасавым у створаных ім вобразах. Паўторым, што ў сваёй творчасці ён падыходзіць да мужыка не як пан, не звысоку, а як свой брат-дэмакрат.

Антыподам мужыка быў пан, памешчык, дваранін. Дваранская літаратура 40—60 год з асаблівай любоўю рысавала вобраз культурнага двараніна, які пакутваў ад разладу з навакольным асяроддзем. Гэта так званы «лішні чалавек». Вобраз такога лішняга чалавека, двараніна-ліберала, даў Некрасаў у паэме «Саша» у асобе Агарына. Гэтая паэма напісана ў 1856 годзе, але далей паэт дае адмоўную характарыстыку двараніну. Выдатныя ў гэтых адносінах такія творы як «Радзіма», «Каму на Русі жыць добра» і шмат іншых. У вобразах «Радзімы» паэт закляймію славутае дваранскае гняздо, з такой любоўю апетае мастаком-лібералам Тургеневым. Разбэшчанасць, дробнае тыранства, бяссэнсавая фанабэрыстасць, — вось што ўбачыў у «дваранскім гняздзе» Некрасаў. І ён рады, што ссечаны цёмны бор, і на бок валіцца пусты і змрочны дом.

Где вторил звону чаши ликований
Глухой и вечный гул подавленных
страданий,
И только тот один, кто всех собой
давил,
Свободно и дышал, и действовал,
и жил...

Непараўнаны вобраз памешчыка Гаўрылы Афанасьевіча Оболта-Обалдуева, у якім Некрасаў раскрыў усе самыя патаемныя думкі, выставіўшы на «усенародныя вочы» самае нутро дваранiна.

Князь Уцяцін — апошняя фігура прыгонніка, якая проста сімвалічна паказвае, куды прышоў дваранскі лад, у што ён вырадзіўся. Двараніна Некрасаў паказвае як чалавек, які добра ведае ўсе самыя тайныя спружыны гэтага свету, які парваў з ім назаўсёды і асудзіў у ім усё да рэшты.

Некрасаў аднойчы заявіў: «Мне барацьба перашкаджала быць паэтам, песні мне перашкаджалі быць байцом!» Але гэта не зусім правільна, бо іменна барацьба стварыла Некрасава як паэта. Лепшыя песні Некрасава — песні барацьбы, песні помсты і журбы. У другім месцы Некрасаў пісаў:

Но покуда не видно солнца ни откуда,
С твоим талантом стыдно спать;
Еще стыдней в годину горя
Красу долин, небес и моря
И ласку милой воспевать...

Ясна, што такое разуменне задач і мэтаў мастацтва стаяла ў простай супрацьлегласці з тым, што прапаведвалі прыхільнікі чыстага мастацтва. Ясна, што паэзію Некрасаў падпарадкаваў справе барацьбы за палітычнае вызваленне, за народ. «Паэтам можаш ты не быць, але грамадзянінам быць абавязан», заяўляў ён, падкрэсліваючы, што паэзія служыць вялікім задачам чалавечага вызвалення. Гэткае разуменне Некрасавым задач і мэтаў мастацтва.

На гэтай аснове склалася ўяўленне, што Некрасаў важны толькі сваім эместам і што форма ў яго слабая. Такое ўяўленне аб мастацкасці вершаў Некрасава ні ў якой ступені не адпавядае сапраўднасці. Вывучэнне формы яго твораў паказала, што перад намі вялікі мастак, выдатны майстар. Мастацкасць даецца вобразамі. Зараз паглядзім на верш і на мову.

Некрасаў майстар перадаваць журбу.

Стонет он по полям, по дорогам,
Стонет он по тюрьмам, по острогам...
Стонет он под овином, под стогом.

Вось прыклад таго, як жыццё дало змест, а ён абумовіў сабой форму.

Я лугами иду—ветер свищет в лугах:
Холодно, странничек, холодно,
Голодно, родименький», голодно.

Чаргаванне «холадна» і «голадна» нагадвае нам выццё, якое чулася ў тыя часы па рускіх вёсках. Як глыбока трэба было ведаць рускае жыццё, каб так здзіўляюча тонка адлюстраваць гэта ў форме верша. Некрасаўскія вершы пявучыя.

Еду-ли ночью по улице темной,
Бури-ль заслушаюсь в пасмурный
день...

Гэтыя вершы просяцца спяваць, галосныя ў іх падвойваюцца, ствараючы мелодыю. Любімейшым размерам Некрасава быў дактыль, які дазваляў яму рабіць бясконцую колькасць варыяцый. Некаторыя гаварылі, што Некрасаў не валодае класічным стылем Пушкіна і Лермантава. Але гэта не адпавядае сапраўднасці, бо на самой справе, як паказваюць яго пародыі, ён цудоўна валодаў класічным вершам.

Фармальны бок вершаў Некрасава, іх майстэрства стаяць на выключна вялікай вышыні. Ён стварыў не толькі новы змест, новыя вобразы, ён стварыў свой асаблівы некрасаўскі рытм, сваю асаблівую музыку верша...

Для сябе ён знайшоў і адпаведную мову.

Мова Некрасава глыбока дэмакратычная. Гэта не стылізацыя, гэта сапраўдная народная мова. Ніхто з рускіх мастакоў да Некрасава не гаварыў такой цудоўнай чыстай рускай мовай простага народа.

Творы яго блішчаць усімі адценнямі размоўнай мовы, выяўляючы багацце параўнанняў, эпітэтаў, выяўленчую і выразную сілу, гнуткасць, напеўнасць. Некрасаў непараўнаны майстар у веданні і ўменні выкарыстоўваць усе багацці жывой размоўнай народнай мовы.

Рэвалюцыйнае значэнне творчасці Некрасава велізарнае. На ёй выхоўваліся цэлыя пакаленні моладзі, яна была сцягам барацьбы супроць прыгонніцтва, самадзяржаўна-бюракратычнага рэжыма. Моладзь ставіла Некрасава вышэй за Пушкіна і за Лермантава, Ленін любіў чытаць Некрасава і надаваў яго творчасці велізарнае значэнне ў гісторыі развіцця нашага рэвалюцыйнага руху. «Яшчэ Некрасаў і Салтыкоў вучылі рускае грамадства ўгледжваць пад прыгладжанай і напамаджанай маскай адукаванасці прыгонніка-памешчыка яго драпежніцкія інтарэсы, вучылі ненавідзець двудушнасць і бяздушнасць падобных тыпаў...» — пісаў Ленін аб значэнні Некрасава. Па словах Крупскай, Ленін аднойчы сказаў: «Ведайце, што ні соцыял-дэмакратычная, ні наогул соцыялістычная бібліятэка без твораў Некрасава немысліма».

Грамадскае значэнне Некрасава абумоўлена яго прыналежнасцю да рэвалюцыйных дэмакратаў па сваіх імкненнях, па сваіх сімпатыях, па характару барацьбы. Адсюль вырастае і яго чыста рэвалюцыйнае мастацкае значэнне. Ён не проста паэт у асяроддзі іншых паэтаў, не, ён праваднір, стваральнік цэлай літаратурнай школы. Ён вялікі рускі народны паэт, змагар за народнае шчасце.

Слышал он в груди своей силы
необ'ятные
Услаждали слух его звуки благодатные,
Звуки лучезарные гимна
благородного —
Пел он воплощение счастия народного!

РАДЗІМА

Вось месцы родныя перада мной ізноў,
Дзе марна ўсё жыццё маіх бацькоў

Цякло сярод гулянак, пахвальбы і п'янства,
Распусты бруднае ды нізкага тыранства;

Дзе рой зняволеных, прыдушаных рабоў
Жыццю паганаму зайздросціў панскіх псоў.

Дзе я на божы свет няшчасны нарадзіўся,
Дзе ненавісць спазнаў, цярпенню навучыўся,

Дзе часам ненавісць спішалася мая;
Тады памешчыкам быць спрабаваў і я;
Дзе ад душы маёй, спазнаўшай рана тленне,

Дачасна адляцеў спакой благаславенны,
І недзіцячых шмат жаданняў і трывог
Агонь пакутлівы паліў, як толькі мог...

Юнацтва майго дні! Ад вас мае ўспаміны:
Пад звонкай назвай раскошных і адзіных

Вы грудзі поўніце і злосцю і хандрой
І так праходзіце ў красе перада мной.
Вось цёмны, цёмны сад... Хто ходзіць па алеі?

Чый смутны воблік там на фоне дрэў бялее?

Я ведаю, чаго заплаканая ты!
Я, маці, ведаю: жыцця час залаты
Ты аддала навек паслушна ліхадзею,
Ты не паверыла, нязбытачнай надзеі —
Вясці баялася ты з лёсам барацьбы,
Ты жрэбій свой няслa ў маўклівасці рабы...

Усё-ж ведаю: душа твая палала бурнай страсцю,

І гордая яна упарта прагла шчасця;
І тое, што цябе ніхто не шкадаваў,
Перадсмяротны шэпт злачынцу даравaў.
І ты, цярпеўшая пакуту, здзек маўкліва
І ганьбу і бяду, што лёс ёй даў жахлівы, —

Ужо цябе няма, душы маёй сястра!
Ты з дому крэпасных любоўніц і псара.
Гарэўшы сорамам, ўручыць лёс пажадала
Таму, каго ні дня не знала, не кахала...
І, паўтарыўшы лёс-злы мацеры ўдвайне,
Ляжала ціха ты, няшчасная, ў труне
З такой халоднаю і строгаю усмешкай,
Што памылкова кат заплакаў несуцешна.


Вось там чарнее дом... Пусты ён і стары:
Дзе слугі, гаеры, сабакі і псары?
Жанчын тут не відаць. Даўней тут штось душыла,
Ў вялікім і малым тужліва сэрца ныла.
Я к няні ўцякаў... Ах, няня!.. Колькі раз
Я слёзы ліў аб ёй у цяжкі сэрцу час;
Але яе імя не варт упамінання.
Даўно не меў я к ёй ні кроплі спачування.

У дабраце яе і шкоднай і пустой
Я рысы ласкавай не бачыў ні адной
І грудзі поўняцца варожасцю, злом новым.
Не! Ў юнасці маёй, мяцежнай і суровай,
Ўспамінаў радасных няма ў душы ніяк;
Але жыццю майму, што жыў ў дзяцінстве я,
І усяму таму чым быў я век ганімы,
Ляжыць пачатак тут, ў кутках маёй радзімы!..

З агідай кідаю навокал позірк свой:
Тут развітаўся бор з уласнай галавой —
Ў гарачы летні дзень ахова і прахлада, —
І ніва спалена, і ленна дрэмле стада,
Схіліўшы галаву над высахшым руччом
І валіцца набок пусты і змрочны дом,
Дзе ўторыў звону чаш і голасу распусты

Глухі і вечны гуд прыгнечаных пакуты,
І толькі той адзін, што ўсіх сабой душыў
Свабодна дыхаў, еў і дзейнічаў і жыў.

Пераклаў АЛЕСЬ ГУРЛО.



Дом у сяле Карабіха, Яраслаўскага раёна, Яраслаўскай вобласці, у якім жыў Н. А. Некрасаў.

(БСФ).

В. Рагуцкі

Н. А. НЕКРАСАВУ

Яго вабілі родныя клёны,
Сенажаці і хвалі ракі...
Адвячоркам на беразе сонным
Пачыналі спяваць бурлакі.

У іх песнях — праклёны багаццю,
Гневу-болю вялікага сказ.
Над калыскай журботная маці
І над хатай задумлівы вяз.

Плылі гэтыя песні далёка,
На спатканне ім хлопчык, як мог,
Паскараў свае лёгкія крокі, —
І камянчыкі беглі з пад ног.

Ён прыходзіў на бераг высокі
Да знаёмых агнёў залатых...
І дзіцячае сэрца глыбока
Раніў сумны бурлацкі матыў.

Беглі годы... Каціліся хвалі...
Гудзеў сумна спрадвечны гушчар.
Людзі слоў незвычайных шукалі.
Іх знаходзіў вялікі песняр.

Ён магутным устаў над краінай,
Дзіўных песень вялікі ўладар,
Быў адданым народным ён сынам
Гнеўнай праўды, свабоды песняр.

Вечар памяці Н. А. Некрасава

8 студзеня ў Доме пісьменніка адбыўся літаратурны вечар, прысвечаны памяці вялікага рускага паэта-дэмакрата Н. А. Некрасава. Вечар адкрыў народны паэт Якуб Колас кароткаю ўступнаю прамовай.

Даклад на тэму «Жыццё і творчасць Н. А. Некрасава» зрабіў Я. Шарахоўскі.

Пасля даклада паэты К. Крапіва, А. Гурло, М. Калачынскі, З. Аксельрод, Ц. Даўгапольскі, Боймвол прачыталі вершы Некрасава ў перакладзе на беларускую і яўрэйскую мову.

Даклад Я. Шарахоўскага і выступленні паэтаў запісаны на плёнку.

М. К.

***

Белдзяржвыдавецтва выпускае ў перакладзе на беларускую мову асобныя некрасаўскія творы. Кнігі выходзяць ў масавым тыражы, добра аформленыя і ілюстраваныя.





З ілюстрацый мастака Лебедзева (1877 г.) да твораў Н. А. Некрасава. НА ЗДЫМКУ: ілюстрацыі да вершаў «Разважанне ля параднага пад'езда» і «Сялянскія дзеці». (Рэпрадукцыя Белсаюзфото).

Некрасаўскія матывы ў творчасці Я. Купалы і Я. Коласа

Вялікі рускі паэт Н. А. Некрасаў з'яўляецца асновапаложнікам рускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай паэзіі. У сярэдзіне другой паловы XIX стагоддзя, ва ўмовах буржуазна-памешчыцкай царскай Расіі, ён быў песняром «мести и печали» народных мас, народнага гора, народнага стогну і пакут працоўных, песняром рэвалюцыйнага пратэсту прыгнечаных мас рускага сялянства супроць памешчыкаў і самадзяржаўя.

Вось чаму невыпадковым з'яўляецца тое, што па сваёй ідэйна-тэматычнай накіраванасці, па сваіму страснаму пафасу «гражданственности», а таксама і па сваіх мастацкіх асаблівасцях, паэтычных матывах Н. А. Некрасаў быў тым вялікім рускім паэтам, які меў і мае велізарнейшы ўплыў на нашых народных паэтаў Янку Купалу і Якуба Коласа.

Я. Купала і Я. Колас з'яўляюцца вучнямі Некрасава. Яны з'яўляюцца асновапаложнікамі беларускай рэвалюцыйна-дэмакратычнай літаратуры; яны ў сваёй паэзіі па-некрасаўску праўдзіва і па-народнаму проста, у высока-паэтычнай форме паказалі гора, нядолю і няволю працоўных мас беларускага сялянства, выразілі магутны рэвалюцыйны пратэст гэтых мас супроць соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, пад якім знаходзіўся наш народ да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Нашы народныя паэты ў сваёй рэвалюцыйна-дэмакратычнай творчасці вельмі блізка стаяць да Некрасава; яны, можна смела сказаць, былі яго таленавітымі вучнямі і ва ўмовах нацыянальна-каланіяльнага царскага рэжыму ў Беларусі былі смелымі прадаўжальнікамі яго паэтычнай справы і хавальнікамі яго мастацкіх прынцыпаў і традыцый. Якуб Колас і Янка Купала многім абавязаны Н. А. Некрасаву.

Нікалай Аляксеевіч Некрасаў у паэме «Жалезная дарога» першы ў сусветнай літаратуры паказаў нам глыбока хвалюючы вобраз прыгнечанага, эксплоатуемага беларуса.

Вобраз бяспраўнага, забітага, эксплоатуемага беларускага мужыка, які з вялікай любоўю паказаны рускім народным паэтам, з'явіўся пасля цэнтральным вобразам у дакастрычніцкай паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Я. Колас і Я. Купала ў сваёй дакастрычніцкай творчасці гэты вобраз бяспраўнага, эксплоатуемага беларускага мужыка рысавалі ўсебакова. Яны сапраўды з'явіліся прадаўжальнікамі бясстрашнага некрасаўскага рэалізма ў паказе жыцця абяздоленага і пакрыўджанага беларускага селяніна.

Вось Якуб Колас рысуе нам вобраз гэтага мужыка-беларуса:

Я балоты сушу, надрываю жывот,
За бясплэнак кашу, рыю землю як крот.
Ўсе вуглы і куты сваім целам палмёў,
Ссек і лес і кусты і дарогі правёў.
Мяне мочыць раса, мяне сонца пячэ
І у песнях маіх сляза ціха цячэ.

Уся паэзія Некрасава прасякнута пафасам «гражданственности». І вось гэты матыў «гражданственности» прадстаўляе сабой і паэзію Купалы і Коласа. Янка Купала ў сваім вершы «Я не паэта» таксама гаварыў аб сабе і сваёй паэзіі, як грамадзянін у пераважнасці.

Якуб Колас у вершы «Песняру» патрабаваў ад паэта, каб ён спяваў аб жыцці народа, аб народным горы, каб ён васпяваў такую песню, якая-б ускалыхнула народныя масы.

Заспявай ты мне песню такую,
Каб мне душу паліла яна,
Каб у ёй ты нядолю людскую
І ўсё вычарпаў гора да дна.
Скажы, як у няволі жывецца,
Як нам шыі здушыла ярмо.

Ёсць у Купалы і Коласа вершы, дзе некрасаўская муза прыбрана ў новыя ўборы. Такімі творамі з'яўляюцца ўсе вершы, напісаныя нашымі паэтамі аб дарэвалюцыйным жыцці беларускага селяніна-бедака.

Вазьміце вершы «Песня жнеяў» Я. Купалы і «Жніво» Я. Коласа і параўнайце іх з вершам Некрасава «В полном разгаре страда деревенская». Якое тут глыбокае супадзенне паказу цяжкой долі вясковай беларускай і рускай жанчыны пры царызме! Вось вобраз рускай сялянскай жанчыны, нарысованы Некрасавым:

В полном разгаре страда деревенская...
Доля ты—русская, долюшка женская!
Вряд-ли труднее сыскать.
Зной нестерпимый: равнина безлесная,
Нивы, покосы, да ширь поднебесная —
Солнце нещадно палит.
Бедная баба из сил выбивается,
Столб насекомых над ней колыхается,
Жалит, щекочет, жужжит!
Приподнимая косулю тяжелую,
Баба порезала ноженьку голую —
Некогда кровь унимать!
Слышится крик у соседней полосыньки,
Баба туда — растрепалися косыньки,
Надо ребенка качать.
Слезы-ли, пот-ли у ней над ресницею,
Право, сказать мудрено.
В жбан этот, заткнутый грязной
тряпицею,
Канут они-все равно!

У гэтым-жа плане Якуб Колас рысуе вобраз беларускай вясковай жанчыны ў час жніва:

Выйшлі на поле, вось, жнеі з сярпамі,
Ў лапцях лазовых, а хто—без лапцей,
Ніва пустымі шуміць каласамі,
Ніва не цешыць жаночых вачэй.
Цяжка ўздыхнуўшы, збанкі пастаўлялі,
Клумкі на межы паклалі жанкі
. . . .
Горача ў полі! Эх, жар дакучае,
Праца марудна, бясконца цяжка!
Спіну і плечы ім боль адбірае,
Аж дзервянее у жнеек рука.
Ціха на полі у поўдзень гарачы,
Хоць-бы дзе кусціка рэдзенькі цень.
Толькі ў калысцы плач чуцен дзіцячы,
Толькі над вухам звініць авадзень...

А вось як у Купалы паддадзены гэты малюнак цяжкой працы жанчыны-жнеі:

Пагнуўшы ў крук худыя спіны,
Сярпом махаючы крывым,
Мы, жонкі, ўдовы і дзяўчыны,
Пры доўгай постаці стаім.
Агніста сонца прыпякае,
Ў губах язык засох, як косць,
Пот горкі вочы залівае,
Змачыў кашулю ўсю як ёсць.
Серп прыбаўляе ранаў косых,
Павекі рэжуць аспюкі,
Як п'яўкі смокчуць кроў з ног босых
Аржэння вострыя сукі.

Як-бы ні розніліся гэтыя тры малюнкі па свайму слоўна-сінтаксічнаму афармленню, у іх вельмі яскрава выступае агульны паэтычны матыў, аднолькавы мастацкі падыход да паказу тэмы пакут вясковай жанчыны. Тут нават у аднолькавым мастацкім плане выкарыстаны трыма рознымі па сваіму таленту паэтамі пейзажныя сродкі. Усе пейзажныя зарысоўкі, — і ў Некрасава: «Зной нестерпимый»: равнина безлесная, нивы, покосы, да ширь поднебесная»; і ў Коласа: «Ціха на полі у поўдзень гарачы, хоць-бы дзе кусціка рэдзенькі цень»; і ў Купалы: «Агніста сонца прыпякае», — на фоне якіх рысуецца бязмежна цяжкая праца жанчын-сялянак, — узмацняюць паказ бясконцай, як «ширь поднебесная» і «няўмольнай, як «агністая спёка ў поўдзень гарачы», пакуты вясковай жанчыны ў старыя часы. Некрасаў вельмі часта для выражэння сваіх рэвалюцыйна-дэмакратычных поглядаў карыстаўся сімвалічным вобразам буры і грому:

Душно! без счастья и воли,
Ночь бесконечно длинна.
Буря-бы грянула, что-ли,
Чаша с краями полна!
Грянь над пучиною моря,
Поле, в лесу засвищи,
Чашу вселенского горя
Всю расплещи!..

Гэты вобраз буры-рэвалюцыі выкарыстоўвалі і нашы народныя паэты. Яны ў сваіх аднайменных вершах «Перад бурай» і «Бура» вельмі ўдала выкарыстоўваюць гэты некрасаўскі матыў. У Коласа і Купалы гэты вобразны матыў гучыць так, як і ў Некрасава. Спачатку даецца малюнак летняй спёкі. У Некрасава гэты малюнак выражаецца адным словам: «Душно!». А ў Коласа і ў Купалы пасля шырокай зарысоўкі гэтай летняй спёкі даецца заключны выгук. У Купалы ён гучыць у наступных словах:

Так толькі бывае прадлетняю бурай—
І птушка замрэ, й пагляд сонца нясмелы,
На небе-ж збіраецца хмура за хмурай
І гром заграхоча, і дрогне свет цэлы.

А ў Коласа так:

Змоўклі ўсе наўкол абшары,
Бо замыслілі штось хмары:
Ой, знаць, бура загудзе.

Некрасаў адносна сваёй музы гаварыў, што яна:

Кричала: Мщение! и буйным языком
В сообщники свои звала господен
гром.

Гэты вобраз грому, як сімвал волі і рэвалюцыі, вельмі часта прысутнічаў у паэзіі Коласа і Купалы. У вершы Коласа «Першы гром» аб гэтым гаворыцца ў наступных словах:

Гай страсянуўся, дрогнула поле,
Долы той гук панеслі.
Ў гэтым раскаце чуецца воля,
Чуецца радасць зямлі.

Усе гэтыя прыклады гавораць аб тым, што паэзія Коласа і Купалы па сваіх вобразна-паэтычных матывах вельмі шчыльна звязана з паэзіяй Некрасава.

Н. А. Некрасаў, як паэт «мести и печали» народных прыгнечаных мас, у сваім паэтычным, песенным рытме, у сваіх слоўна-маляўнічых сродках быў арыгінальным паэтам у гісторыі рускай класічнай літаратуры XIX стагоддзя. Некрасаў у сваёй паэзіі даў новыя, няведаныя ні Пушкіным, ні Лермантавым паэтычна-народныя рытмы і мелодыі верша. Некрасаўскія мелодыі з'яўляюцца задушэўным голасам рускага народа; яго вершаваная рытміка прасякнута «грамадзянскім» пафасам, у аснове яе ляжыць «месть и печаль» народных мас, якія стагналі пад прыгнётам царызма. Першакрыніцай некрасаўскай журботна-тужлівай, прасякнутай помстай і пратэстам песні з'яўляўся фальклор. Купала і Колас таксама ішлі па гэтай лініі. І таму рытмічна-песенны склад вершаў Купалы і Коласа па сваіх журботна-гнеўных, пратэстуючых матывах вельмі падобны да некрасаўскага рытму, якому ўласціва народная задушэўнасць.

Вазьміце такія творы, як «Там», «Мужык», «Перад вясельлем», «Што ты спіш» — Я. Купалы і «Мужык», «Песняру» — Я. Коласа. У гэтых вершах кожны можа ўгледзець і адчуць арганічную і плённую вучобу Купалы і Коласа ў Некрасава. Іменна ў гэтых вершах вельмі моцна гучаць матывы журбы і гневу, скаргі і помсты, пратэсту і рэвалюцыйнага закліку.

Некрасаў любіў матывы народнай песні, ён іх часта перапрацоўваў так, што яны набывалі новую якасць. У яго надзвычай багата твораў, якія так і называюцца песнямі: «Песни Еремушке», «Колыбельная песня», «Песня зимы», «Последние песни» і інш. Яго вялікія паэмы «Мороз, красный нос», «Коробейники» і асабліва «Кому на Руси жить хорошо» напісаны ў плане народнай песні і разам з гэтым нават складаюцца з паасобных песень.

Невыпадковым з'яўляецца той момант, што вялікая колькасць твораў таксама, як і ў Некрасава, у Коласа і ў Купалы называюцца песнямі. Вось гэтыя назвы твораў у Купалы: «Каму вас,, песні», «З маіх песень», «Да песень», «Песня аб песнях», «Плачуць мае песні, «З песень нядолі», «З песень аб сваёй старонцы», «З песень аб бітвах», «Песня вольнага чалавека», «З песень беззямельнага», «З песень аб вясне», «Песня сонца», «Песня і сіла», «З песень жыцця», «З песень аб мужыцкай долі», «Песні вайны» і г. д., у Коласа «Жніўныя песні», «Песні зімы», «Пад спеў ветру», «Старыя песні», «Родныя песні», «Песня п'янага», «Песня няволі», «З песень адзінокага», «Песні вясны», «Песня аб вясне» і г. д. Падобных прыкладаў можа было-б у некалькі разоў павялічыць.

Уся наша советская паэзія на аснове соцыялістычнага рэалізма развівае некрасаўскія прынцыпы фальклорнага песеннага верша. Гэта можна бачыць ва ўсёй нашай шматнацыянальнай паэзіі.

Вазьміце сучасныя вершы Джамбула, Сулеймана Стальскага, Янкі Купалы, Коласа, Лебедзева-Кумача, Дзем'яна Беднага і іншых паэтаў — і вы ўбачыце, што народная песеннасць, якая культывавалася яшчэ Некрасавым, арганічна бытуе ў нашай паэзіі, з'яўляючыся песеннасцю новага радаснага і прыгожага нашага жыцця.

М. ЛАРЧАНКА.

„У пушчах Палесся“ ў Віцебскім Дзяржаўным драматычным тэатры



Аўтар п'есы «У пушчах Палесся» народны паэт рэспублікі Якуб Колас. (Карціна мастака Н. І. Гусева). Фотарэпрадукцыя І. Капліноскага.

Пра сваю п'есу

Да работы над п'есаю «У пушчах Палесся» я прыступіў у пачатку чэрвеня 1937 года і скончыў яе 1 жніўня. Час для напісання п'есы дужа малы. Гэтым у значнай меры і тлумачыцца тыя хібы, якія не пазбаўлена п'еса і якія на-хаду сумесна з тэатрам выпраўляліся і выпраўляюцца. Самаю буйнаю заганаю п'есы лічу тое, што яна мае багата карцін, што адзін з важнейшых герояў, тып бальшавіка-падпольшчыка (Жыбуль) мне не ўдаўся. Ён шмат гаворыць, а ў дзеянні не відэён. Дзейнасць дыверсанта-шпіёна не разгорнута і не развіта. З III акта п'еса ідзе на зніжэнне ў напружанасці. Не задавальвае мяне, як і гледача, і фінал п'есы. Мне і тут не ўдалося даць яркую і эфектную канцоўку.

Ёсць цэлы рад момантаў і па лініі пастаноўкі, якія трэба выправіць. Выпраўленне можа быць зроблена лёгка. Адзначу некаторыя з іх.

1. У другой карціне першага акта польскія акупанты прыходзяць з таго боку, куды адышлі часці Чырвонай Арміі,— ненатуральна.

2. Сцэна каля стажка сена праходзіць у занадта паскораным тэмпе.

3. Аўгіння ў штабе белапалякаў абмірае, калі польскі афіцэр паведамляе ёй аб забойстве Мартына Рыля. Гэтак магло здарыцца з жанчынаю гарадской складкі, а для сялянкі гэта не тыпова.

4. Трэцяя карціна перагружана. Песню Рыля трэба апусціць, таксама як і паведамленне яго аб цяжкім становішчы батальёна Шалёхіна. Лічу патрэбным сказаць, што гэтую акалічнасць адзначае рэжысёр тав. Дарвішаў, і я з ім цалкам згодны.

Ёсць і іншыя дробязі, якія патрабуюць перагляду і аб якіх я гаварыў рэжысёру.

Афармленне п'есы, зробленае мастаком Бусулаевым, і музыка, напісаная кампазітарам Красевым, на мяне асабіста робяць добрае ўражанне.

Сумеснаю работаю з Віцебскім тэатрам я задаволен. Прыемна адзначыць, што ў мяне і ў рэжысёра заўсёды знаходзіцца агульная пазіцыя, і мы прыходзім да пагаднення сваіх поглядаў на тыя ці іншыя моманты, што датычаць як тэкста, так і пастаноўкі п'есы.

Работу над удасканаленнем п'есы лічу яшчэ не скончанай. Калі-ж адзначаныя хібы будуць выпраўлены, то той цёплы прыём, з якім сустрэлі гледачы Віцебска п'есу, будзе апраўдан.

ЯКУБ КОЛАС.

Захапляе жыццёвая праўда

У п'есе «У пушчах Палесся» я іграю ролю Саўкі Мільгуна, вясковага злодзея. Вобраз адмоўны. Саўка, падкуплены кулакамі, здраджвае партызанам, становіцца здраднікам-шпіёнам. Мне хацелася паказаць не толькі гэты факт, а ўскрыць прычыны, якія прывялі яго на гэты шлях. Я яго трактую, як чалавека страсці. Ён прадукт сістэмы капіталізма — царскага гнёту на вёсцы. Мне здаецца, што пры іншых умовах ён мог-бы стаць карысным чалавекам. І гэтую думку пацвярджае ў коласаўскай п'есе вобраз прататыпа Саўкі —Дарвідошкі. Дарвідошка, які быў парабкам, пайшоў шукаць польскаму жаўнеру маладзіцу, трапіў у палон да партызанаў і там, пад уплывам іх, стаў барацьбітом. Ён таксама чалавек страсці, але яму дадзены іншы кірунак. Капіталізм робіць з Саўкі злодзея, здрадніка, п'яніцу, шпіёна. Соцыялістычная рэвалюцыя робіць з Дарвідошкі каштоўнага чалавека, які класава асвядоміў сябе. Саўка, такім чынам, ёсць ахвяра капіталізма. Я яго паказваю як здрадніка. Ён па п'есе гіне. І я, як актор, паказваю яго маральнае і палітычнае апусташэнне.

Хочацца ў далейшым працаваць над вобразамі новых п'ес Коласа. Мне хацелася-б толькі аднаго, каб свае драматургічныя творы Колас пісаў не ў карцінах, а ў актах. Гэта дапаможа акторам і тэатру стварыць на матэрыялах п'ес Коласа яшчэ больш хвалюючыя спектаклі.

П. СЯРГЕЙЧЫК.

ЗАЎВАГІ ДРАМАТУРГУ

Віцебскі беларускі тэатр ужо другі раз супрацоўнічае з Якубам Коласам. Гарачае жаданне творчых работнікаў тэатра атрымаць ад Якуба Коласа ў 1938 годзе новую п'есу характарызуе тыя пачуцці, з якімі калектыў скончыў працу над п'есай «У пушчах Палесся».

Я з вялікім задавальненнем працавала над вобразам Аўгінні ў п'есе «У пушчах Палесся».

Наш драматург Якуб Колас у сваіх драматургічных творах няспынна расце, што відаць з параўнання п'есы «Вайна—вайне» з п'есай «У пушчах Палесся». Гэта нараджае ўпэўненасць, што наступным творам Якуб Колас парадуе нас яшчэ больш.

Мне здаецца, што асноўным недахопам Коласа-драматурга, як у першай, так і ў другой п'есе, з'яўляецца імкненне паставіць і вырашыць багата праблем, што не дае магчымасці шырока распрацаваць кожную паасобку. Мне здаецца, што калі ў наступнай п'есе Колас паставіць і вырашыць адну ці дзве праблемы (у апошнім выпадку адну асноўную), то гэта дасць магчымасць стварыць яшчэ больш поўнакроўныя вобразы.

Сакавітая мова, народнасць твораў, насычаных беларускім фальклорам, жыццёвасць герояў Якуба Коласа павінны быць памножаны на драматургічнае майстэрства і тады мы атрымаем ад нашага майстра слова выдатныя творы для сцэны.

Шчырае жаданне працаваць з Якубам Коласам ёсць у нас ва ўсіх. Мы ўсе вельмі чакаем яго наступную п'есу і горача жадаем працаваць над яе вобразамі.

Р. КАШЭЛЬНІКАВА.

ЧАКАЕМ НОВЫХ П'ЕС Я. КОЛАСА

Нам удалося прыцягнуць да работы ў тэатры народнага паэта БССР Якуба Коласа. Ён перапрацаваў свае першыя сцэнічныя карціны «Вайна—вайне» у п'есу, якая мела поспех, адзначаны ўсёй грамадскасцю БССР. Яго цудоўная народная мова загучала ў жывых вобразах, на сцэне. Другая п'еса Я. Коласа «У пушчах Палесся», напісаная ім спецыяльна да 20-годдзя Вялікага Кастрычніка, з'яўляецца каштоўным драматургічным творам, новым этапам развіцця выдатнага дараваня паэта. Мне, як рэжысёру-пастаноўшчыку першых двух драматургічных твораў Якуба Коласа, хочацца ад усёй душы пажадаць яму творчага ўздыму для напісання і трэцяй п'есы, п'есы на гістарычную тэму — аб Крычаўскім паўстанні.

В. ДАРВІШЭЎ.
Мастацкі кіраўнік Віцебскага Белдзяржтэатра.



«У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ» НА СЦЭНЕ ВІЦЕБСКАГА ДЗЯРЖТЭАТРА. НА ЗДЫМКУ (злева): акт. Кашэльнікава ў ролі Аўгінні, вучаніца шостай школы г. Віцебска Маркеліс у ролі дачкі Аўгінні — Алесі; заслужаны артыст рэспублікі Ільінскі ў ролі дзеда Талаша.

Чарговыя работы тэатра

Перад Віцебскім Белдзяржтэатрам стаіць зараз адказная і вялікая задача — замацаваць поспехі, якіх тэатр дабіўся сваёй юбілейнай пастаноўкай «У пушчах Палесся», і ісці па шляху далейшага творчага росту.

І таму калектыў тэатра з радасцю будзе чакаць новай п'есы Я. Коласа, якую ён абяцаў напісаць нам па матэрыялах Крычаўскага народнага паўстання.

Акрамя п'ес пісьменнікаў Совецкай Беларусі, наш тэатр у гэтым годзе ўключыў у рэпертуар рад п'ес совецкіх пісьменнікаў іншых рэспублік.

Сваю п'есу «Дружба» даў нам паэт Віктар Гусеў. У вершах гэтай п'есы, у лірычна хвалюючых радках яе хаваецца глыбокая шчырасць і любоў да нашых людзей, да радзімы, да партыі. Яна ўскрывае ўзаемаадносіны новых людзей.

Тэатр уключыў у свой рэпертуар п'есу Барыса Рамашова «Доктар Скварцоў» («Родны дом»). У гэтай п'есе ўскрываецца агідная дзейнасць трацкісцка-бухарынскіх агентаў фашызма. Яна дае матэрыял для стварэння хвалюючага спектакля, які будзе мабілізаваць пільнасць і ўзброіваць масы ў барацьбе з ворагамі народа.

П'еса маладога ленінградскага драматурга Л. Карасёва «Агні маяка» ужо рыхтуецца тэатрам. Яна расказвае аб класавай пільнасці совецкіх патрыётаў, яна папярэджвае аб тым, што вораг не дрэмле.

Тэатр жадае паказаць вобраз новай жанчыны, якая вырасла за гады рэволюцыі ў велізарную сілу, і таму мы чакаем п'есу П. Паўленка, якую ён прысвячае совецкай жанчыне.

Рэпертуар тэатра за час яго існавання паказаў, што тэатр несур'ёзна ставіўся да класічнай драматургіі. У гэтым годзе мы ўключылі ў свой рэпертуар тры класічныя п'есы.

Першая з іх — «Мяшчане», п'еса нашага любімага пісьменніка Максіма Горкага. Тэатр ужо рыхтуецца да пастаноўкі гэтай п'есы. У рэпертуар уключана таксама п'еса іспанскага драматурга Лопе-дэ-Вега і «Каварства і любоў» Шылера.

Тэатр уключыў у свой рэпертуар дзве п'есы пісьменнікаў захаду: п'есу «Овад» па Войніч і «Мае злачынствы» Бера і Вернейля — сатырычную п'есу аб сучасных норавах, правасуддзі, узаемаадносінах, якія пануюць у буржуазным грамадстве. Над гэтай п'есай калектыў тэатра працуе ўжо. Ставіць п'есу артыст малага тэатра К. А. Зубаў.

Адначасова тэатр працуе і над п'есай С. Найдзёнава «Дзеці Ванюшына».

Пастаноўкамі класічных п'ес і п'ес совецкіх аўтароў, працай з беларускімі драматургамі па ўзбагачэнню рэпертуара арыгінальнымі драматургічнымі творамі тэатр здолее задаволіць патрабаванні свайго гледача, няспынна творча расці. І. ДОРСКІ.

АБ П'ЕСЕ І ВОБРАЗЕ

Творы Якуба Коласа мяне захапляюць сваёй глыбокай народнасцю, музычнасцю і паэтычнасцю мовы.

Асаблівая ўнутраная чыстата і яснасць уласціва лепшым вобразам п'есы «У пушчах Палесся» — вобраз дзеда Талаша, Аўгінні і Дарвідошкі.

Нажаль, не ўсе вобразы гэтай п'есы напісаны роўнацэнна. Выклікае дасаду схематызм такіх вобразаў, як Жыбуль і Рыль, шэрасць у абмалёўцы партызанскай масы. Таксама недастаткова глыбока распрацаваны лініі вобразаў нацыяналіста, шпіёна.

Я з задавальненнем іграю ролю Дарвідошкі — гэтага дзівакаватага, але таленавітага вясковага хлапца. З такім-жа задавальненнем я і рыхтаваў гэтую ролю. Тлумачыцца гэта выключнай яскравасцю, з якой Дарвідошка напісаны Коласам. Прыемна іграць вобраз простага вясковага хлопца, прадстаўніка беларускага беднейшага сялянства, які ў працэсе развіцця рэволюцыйных падзей пераходзіць ад стыхійнага разумення іх да класава-асвядомленага. Паказ станаўлення класавай свядомасці — самае цікавае ў ролі Дарвідошкі.

П. МАЛЧАНАЎ.



«У ПУШЧАХ ПАЛЕССЯ» НА СЦЭНЕ ВІЦЕБСКАГА ДЗЯРЖТЭАТРА. НА ЗДЫМКУ (злева направа): (арт. Майсак у ролі Максіма, акт. Бандарчык у ролі бабкі Насты, акт. Лагоўская ў ролі Панаскі і арт. Шэлег

В. ВОЛЬСКІ

СПЕКТАКЛЬ ПРА НАРОДНЫ ГЕРАІЗМ

Вялікім поспехам карыстаецца ў Віцебскім Белдзяржтэатры пастаноўка п'есы народнага паэта Якуба Коласа «У пушчах Палесся». У аснову гэтага твора пакладзены змест шырокавядомай і папулярнай у масах аповесці Коласа «Дрыгва».

Поўныя драматызма эпізоды суровай і герaічнай барацьбы беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў, вобразы народнага партызанскага руху, які ўзначальваўся комуністычнай партыяй, ажываюць на сцэне і глыбока хвалююць узрушанага гледача. З нездрыўнай, напружанай увагай сочыць глядач за лёсам герояў, за ходам драматычных падзей. Ён радуецца перамогам партызан, ён сумуе разам з імі над стратамі. Спектакль часта перапыняецца гучнымі воплескамі залы.

Сіла гэтага спектакля ў яго прастаце і народнасці, у тым моцным струмені совецкага патрыятызму, які ліецца са сцэны ў залу, натхняючы гледача. Які моцны водгук выклікаюць, напрыклад, у зале словы Талаша пра абарону сваёй роднай зямлі ад панскіх драпежнікаў. З якім хваляваннем успрымае глядач цвёрды і мужны адказ Мартына Рыля на допыце ў польскай разведцы аб тым, што партызаны — не зброд, што яны — тутэйшыя людзі і змагаюцца супроць чужаземнага збродзу.

У п'есе і ў спектаклі добра паказана непарыўная сувязь беларускага народа з Чырвонай Арміяй. У эпізодзе адыходу чырвонаармейскага батальёна з вёскі, у сцэне прыходу Талаша ў штаб батальёна, у эпізодах баявога яднання партызанаў з чырвонаармейцамі з асаблівай сілай і выразнасцю адчуваецца гэтае кроўнае сваяцтва, гэтая шчыльная знітаванасць, гэтая арганічная блізасць чырвонаармейцаў да мясцовага насельніцтва, да працоўных мас глухога і дрымучага, амаль легендарнага Палесся.

Малюючы вобразы народных герояў партызанскай барацьбы, п'еса раскрывае адначасова варожую сутнасць прадстаўнікоў беларускага кулацтва, здраднікаў народа, агідных паслугачоў і саюзнікаў белапольскіх акупантаў. Аўтар п'есы імкнецца таксама мабілізаваць увагу гледача на асобных момантах падрыўной шпіёнскай дзейнасці польскай разведкі ў радах Чырвонай Арміі і ў партызанскіх атрадах.

Умела карыстаючыся гэтым багатым матэрыялам, тэатр здолеў стварыць паказ сапраўды народны, праўдзівы і шчыры, жыццёвы і непасрэдны. У гэтым спектаклі няма ні танных эфектаў, ні фармалістычных прэтэнзій. Няма ў ім бліскучай, фальшывай пампезнасці, знадворнага багацця, феерычнасці, мішуры. Пастаноўка рэжысёра В. А. Дарвішава вытрымана ў простых і мужных тонах, з гэта цалкам адпавядае характару і зместу п'есы.

Асабліва добра гучаць у пастаноўцы масавыя народныя сцэны. Удала вырашан з рэжысёрскага боку эпізод захопу партызанамі польскага штаба, калі адзін за адным, схіліўшыся, крадуцца з поўзмроку ў маўклівай і спрытнай чарадзе байцы-партызаны. Удалым трэба прызнаць і фінал гэтай сцэны — паяўленне партызана-жартаўніка Дарвідошкі (актор Малчанаў) у вакне захопленага будынка. Бурныя, неаднаразовыя воплескі залы яскрава сведчаць аб гэтым.

Аўтару п'есы, таксама як і амаль усім нашым драматургам наогул, перашкаджаюць іншы раз празмерну шчодрыя адносіны да матэрыялу. П'еса «У пушчах Палесся» перанасычана падзеямі і здарэннямі. У ёй перакрыжоўваецца некалькі тэм і сюжэтаў. Драматургічнага матэрыялу ў гэтым творы хапіла-б на некалькі п'ес. Зразумела, што пры такой перагрузцы не ўсе сюжэтныя лініі маглі быць давезены да лагічнага канца, не ўсе вобразы распрацаваны з аднолькавай паўнатой і закончанасцю.

Лінія кахання Мартына Рыля і Аўгінні смела магла быць пакладзена ў аснову самастойнай п'есы. Тое самае можна сказаць і пра эпізоды з польскім шпіёнам Краскіным, накіданыя ў п'есе толькі эскізна, схематычна. Гэта таксама тэма для самастойнага твора, тэма, як яна не вырашана як след у п'есе «У пушчах Палесся». Паказ ворагаў, выкрыццё прыёмаў падрыўной работы польскай разведкі дадзены тут у спрошчаным выглядзе, у звужаных маштабах. Сцэна ў польскім штабе (пасылка Краскіна ў Чырвоную Армію) здаецца нам недастаткова пераканальнай: размовы і паводзіны ворагаў і, асабліва, самога Краскіна-Гембіцкага — даволі схематычныя. Занадта лёгка пранікае Краскін у Чырвоную Армію і занадта лёгка яго выкрываюць.

У сапраўднасці такія рэчы адбываліся куды больш складана.

Мала праўдападобным здаецца нам эпізод з вартавым у польскім штабе. Сцэны ў польскай контрразведцы (3-ці акт, трэцяя карціна) не пазбаўлены пэўнай наіўнасці. Між іншым, варта было-б перанесці за кулісы сцэну расстрэлу польскіх салдатаў у другім акце.

Лішняй і непатрэбнай з'яўляецца, на нашу думку, штучна ўстаўленая ў канцы 1-га акта сцэна размовы з Жыбулем перад заслонай. Паводле свайго зместу яна не дае нічога новага для разумення падзей у п'есе, а сваёй умоўнасцю, пазбаўленая рэальнай, канкрэтнай абстаноўкі, парушае агульны стыль спектакля.

Нарэшце, спектаклю нехапае драматургічна моцнага фінала. Яго варта было-б дапрацаваць.

Цэнтральнае месца ў паказе займае асноўны герой п'есы — дзед Талаш. Яркі і самабытны вобраз старога партызана пануе на сцэне і ў сэрцах гледачоў. Шматвяковая мудрасць народа гучыць у кожным яго слове, у кожным учынку. Гэта прыродная мудрасць, гэты здаровы сэнс, які ідзе з самых гушчаў, з самых глыбінных нетраў беларускіх народных мас, спалучаецца ў дзеда Талаша з розумам і свядомасцю рэволюцыйнага барацьбіта, са стратэгічнымі здольнасцямі партызанскага камандзіра, які з сваім атрадам змагаецца пад кіраўніцтвам бальшавікоў, разам з Чырвонай Арміяй, супроць польскіх паноў і акупантаў. Вобраз старога дзеда-партызана, створаны Коласам з вялікім замілаваннем і цеплынёй, знайшоў сабе бліскучую сцэнічную інтэрпрэтацыю ў выкананні засл. арт. БССР А. К. Ільінскага. Гэта вобраз вялікай прывабнасці, вобраз праўдзівы і моцны. У ім няма ніякай штучнай прыўзнятасці. Ён натуральны, жывы і просты ад пачатку і да канца спектакля, надзвычай цэльны і гарманічны ва ўсіх сваіх праявах. У ім адчуваецца мяккасць і цеплыня і адначасова спакойная мужнасць, душэўная роўнавага, вялікая маральная сіла і непахісная ўпэўненасць у сваёй праўдзе, у праўдзе народнай справы. Вобраз Талаша ў выкананні А. Ільінскага нібы асветлены знутры нейкім цёплым, роўным і моцным святлом, святлом розуму і глыбокага пачуцця. З якой скромнасцю і адначасова чалавечай годнасцю прымае Талаш абранне яго камандзірам «партызанскага войска». Як спакойна, разумна і хітра, з крыху схаванай іроніяй, сустракае ён у лесе падасланага ворагамі шпіёна Саўку Мільгуна. Як проста і разважліва вырашае ён стратэгічныя задачы атрада. Колькі ў ім гумару, сардэчнасці, чалавечай цеплыні.

Глядач любіць Талаша. На працягу ўсяго спектакля гэты вобраз неадрыўна звязаны з залай нябачнымі ніцямі жывога спачування і цёплай сімпатыі. Хвалюючыся, сочыць глядач за кожным словам, за кожным рухам свайго героя. Праўдзівасць, жыццёвасць — вось аснова гэтага вобраза. Глядач любіць яго, бо бачыць у ім увасабленне лепшых якасцей народа. Глядач верыць яму, бо ўсе ўчынкі яго заўсёды жыццёвыя, заўсёды лагічныя і паслядоўныя. Глядач яскрава, увачавідкі бачыць у спектаклі, чаму такі стары чалавек, як Талаш, пайшоў у партызаны, чаму ён зрабіўся начальнікам партызанскага атрада, чаму ён наогул узяўся за зброю. Роля Талаша праведзена ў спектаклі бездакорна. Яна глыбока прадумана і адчута. Вобраз народнага героя створан А. К. Ільінскім з вялікім майстэрствам, з тонкім разуменнем сцэнічнага такту, з выключнай увагай да найдрабнейшых дэталяў выканання, з якіх складаецца жыццёвасць і гарманічная цэльнасць вобраза.

Моцнае ўражанне пакідаюць такія эпізоды, як дзед Талаш у лесе каля дуба, як спатканне яго з Рылем, як прыход Талаша ў сваю хату, як размова яго адзін-на-адзін з Саўкам. У гэтых сцэнах з асаблівай сілай гучыць выдатнае сцэнічнае майстэрства выканаўцы. Актор цудоўна ўладае жэстам, рухам, інтанацыяй. Ён умела карыстаецца паўзамі. Ён выразна і трапна абытрывае рэчы.

Мужны, разумны і стрыманы, але халодны, недастаткова раскрыты вобраз Мартына Рыля стварыў акт. С. В. Скальскі. Праўда, актору перашкаджаюць некаторыя кампазіцыйныя асаблівасці п'есы. Лінія Рыля ў п'есе, гераічная і мужная, раптоўна абрываецца яго нечаканай смерцю. Недастаткова апраўданым з драматургічнага боку здаецца нам з'яўленне Рыля пад выглядам жабрака ў контрразведцы, але ў сэнсе акцёрскага выканання якраз гэты момант з'яўляецца ў С. Скальскага найбольш моцным, найбольш удалым. У далейшым, калі жабрак выкрыты і перад гледачом паўстае Мартын Рыль, глядач з напружаннем і хваляваннем успрымае яго мужныя, гераічныя словы, але блізасць смерці яго на сцэне не адчуваецца. Глядач да апошняга моманту не верыць у рэальнасць і немінучасць гэтай смерці.

Драматызм вобраза Аўгінні ўдала перадае акт. Р. Н. Кашэльнікава. Але часам у выкананні яе, у асобных інтанацыях адчуваецца некаторая манернасць, рафінаванасць, неўласцівыя для Аўгінні, жанчыны з народа, натуры цэльнай і здаровай.

Непасрэдны і жыццярадасны вобраз спрытнага і рухавага партызана — жартаўніка Дарвідошкі стварыў акт. П. С. Малчанаў. Выкананне гэтай ролі сустракае з боку гледача жывое і нязменнае ўхваленне на працягу ўсяго спектакля.

У гратэскавым, камедыйным плане вядзе сваю ролю вясковага злодзея, кулацкага правакатара Саўкі Мільгуна акт. Ц. Н. Сяргейчык. Вобраз гэты даволі каларытны, створаны ён акторам досыць уважліва і дэтальна, але выканаўца не раскрывае як след сапраўднай сутнасці Саўкі. Ён робіць упор на жартаўлівасць яго, на моманты камедыйнага парадку і таму ў гледача ствараюцца двaістыя адносіны да Саўкі. Ён выклікае смех. У асобных эпізодах глядач нават схільны спачуваць Саўку і да апошняга моманту не верыць таму, што Саўка сапраўды стане правакатарам. Глядач спадзяецца, што Саўка ашукае нарэшце кулакоў і выкрые іх планы перад партызанамі. Варожая мярзотная сутнасць Саўкі застаецца да канца не раскрытай. І таму яго смерць ад рукі партызанаў здаецца для гледача нечаканай. Па сутнасці Саўка і Дарвідошка з'явіліся ў спектаклі супрацьлеглымі рознавіднасцямі аднаго сцэнічнага тыпу. У ігры акт. Сяргейчыка адчуваецца часам некаторая напружанасць.

Вобраз падпольшчыка Жыбуля (акт. Н. П. Звяздачотаў) з'яўляецца ў п'есе і ў спектаклі найбольш няўдалым. Роля партыі ў кіраўніцтве партызанскім рухам была, як вядома, велізарнай. У п'есе яна ажыццяўляецца і камандзірамі Чырвонай Арміі (Шалёхін, Букрэй) і радавым партыйцам Рылем. Акрамя гэтых вобразаў, аўтарам увезены ў п'есу і дадатковы вобраз Жыбуля. Але драматургічныя функцыі яго застаюцца няяснымі, невыразнымі. Не будучы арганічна і непасрэдна звязаным з развіццём сюжэта, ён застаецца ў п'есе не больш як рэзанёрам, які ўвесь час у агульных сказах намагаецца растлумачыць гледачу тое, што добра зразумела і без яго тлумачэнняў. Часам сваімі аднастайнымі навучаннямі ён толькі псуе ўражанне ад яскравых і драматычных, хвалюючых эпізодаў на сцэне. Гэты вобраз патрабуе значнай драматургічнай дапрацоўкі. Інакш ён застанецца фігурай непатрэбнай, штучна ўведзенай у мастацкую тканку п'есы, тым больш што выканаўца гэтай ролі, акт. Звяздачотаў адносіцца да вобраза Жыбуля пасіўна, безнадзейна і не спрабуе ажывіць яго нават там, дзе гэта магчыма.

Вобраз войта Бусыгі не знаходзіць сабе правільнай сцэнічнай трактоўкі ў выкананні акт. З. С. Вялікага. Рухі яго нейкія штучныя, ненатуральныя. Актор пайшоў па лініі чыста вонкавай, стварыўшы плакатную схему кулака. Трэба адзначыць, што ўвесь знадворны выгляд Бусыгі, яго вопратка і аблічча, з'яўляюцца нетыповым, не характэрным для беларускіх умоў.

Вясковыя кулакі Бруй (акт. Л. П. Міхайлаў) і, асабліва, Бірка (акт. І. А. Тупік) захапляюцца больш, чым трэба, момантамі камедыйнага парадку, імкнуцца выклікаць смех у публікі, і гэтым зніжаюць соцыяльнае значэнне вобразаў, бо справы і ўчынкі іх па сутнасці сваёй зусім не смешныя.

Прыемны, просты і шчыры вобраз камандзіра Букрэя стварыў акт. А. Г. Шэлег. Трэба наогул адзначыць, што гэта — актор вялікай сцэнічнай прывабнасці. Этнаграфічна правільна, досыць жыццёва, але з некаторай сухасцю праводзіць ролю бабкі Насты акт. Т. А. Бандарчык. З іншых выканаўцаў варта вылучыць акт. П. І. Іванова ў ролі камбата Шалёхіна, Г. В. Майсака ў ролі Максіма, Ю. І. Чарнова ў ролі Крулеўскага, А. М. Гарэлава ў ролі яго памочніка, В. І. Лагоўскую ў ролі Панаса.

Спектакль ідзе ў лёгкім, жывым тэмпе. Трэба адзначыць лёгкасць і непрымушанасць ігры амаль усяго ансамбля, рухавасць і спрытнасць актораў на сцэне.

Амаль усе асноўныя эпізоды п'есы разгортваюцца на фоне палескага краявіду, увасобленага ў прыгожым дэкаратыўным афармленні мастака Басулаева. Магутныя, стогадовыя дубы, высокія, стромкія хвоі ствараюць на сцэне дзівосны каларыт Палесся. Удалае дэкаратыўнае афармленне, шчыльна звязанае з агульным стылем спектакля, стварае з ім адно арганічнае цэлае і не мала спрыяе поспеху пастаноўкі.

Добра гучыць у спектаклі музычнае афармленне камп. М. І. Красева, пабудаванае на народных, песенных мелодыях.

Пастаноўка «У пушчах Палесся» з'яўляецца выдатным поспехам тэатра.

ТВОРЧАСЦЬ УСЕВАЛАДА КРАЎЧАНКІ

Маладыя празаік Усевалод Краўчанка нарадзіўся ў 1915 годзе ў вёсцы Каплічы, на Мазыршчыне, у сям'і вясковага настаўніка. Да 1930 года вучыўся ў сямігодцы ў Нароўлі, пасля ў Мазырскім рабфаку, які скончыў у 1932 годзе. Пачаў літаратурную дзейнасць з селькораўскіх заметак у мазырскай раённай газеце, потым пісаў фельетоны, нарысы, артыкулы. Далей працаваў ў рэдакцыі газеты «Большэвік Палесся».

Усевалод Краўчанка з'яўляецца аўтарам кніжкі для дзяцей «Таямнічая вышка», а таксама апавяданняў «Дзедаў прынцып», «Радасць», п'есы «Торная дарога», надрукаваных у журнале «Полымя рэвалюцыі».

Усевалод Краўчанка праўленнем Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР прыняты ў кандыдаты Саюза пісьменнікаў.

СУСТРЭЧА

(Апавяданне)

На скрыжаванні двух дарог, на ўзгорку, каля старой пахілай бярозы стаяў дубовы крыж. У чатыры розных бакі адсюль беглі чатыры дарогі. Па адной з іх з-пад лесу, ад чыгуначнай станцыі ішоў высокі юнак.

Сонца яшчэ не ўзыходзіла. Шэры перадранішні туман слаўся па лагчынах прыдарожных палёў, як дым, што сцелецца перад дажджом з комінаў вясковых хат.

Ідучы, юнак час-ад-часу азіраўся па баках — відаць, мясцовасць гэтая была мала знаёмая яму, да таго-ж туман засланіў дарогу. Але калі на ўзгорку каля пахілай бярозы ён убачыў крыж, ён упэўнена паскорыў хаду і на ўзгорак выйшаў ужо амаль подбегам.

На крыжы абмытая стрэчнымі дажджамі была прымацавана дошка з надпісам. Юнак перш-на-перш кінуўся да яе.

«Тут пахаваны браты Рымары, Антон і Цярэшка, слаўныя цімашкоўскія партызаны, каторыя пралівалі кроў за нашу совецкую ўладу і каторых павесілі белыя гады. Смерць гадам!»

Хлапчына прачытаў надпіс, скінуў шапку і замер, у задуме пазіраючы на крыж, зарослы ад даўнасці шэрым мохам. Клапатліва, нібы ўспамінаючы нешта, зашаптала бяроза, калі асенні вецер крануўся яе старэчых галін, і разам з ветрам паляцела ўдаль некалькі пажоўклых лістоў.

Забарвела над лесам неба, растаялі туманы, а юнак усё стаяў і паглядаў на крыж ля пахілай бярозы, на зарослы мохам высокі помнік братам-партызанам.

— Пашто, голубе, глядзіш? — пачуўся раптам голас з дарогі.

Юнак ачнуўся і паглядзеў назад. На дарозе стаяў высокі, шыракаплечы стары з кашалём за плячыма і тоўстым кіем у руках. Белая барада спадала на грудзі старога.

Юнак маўчаў.

— Пашто, пытаюся, глядзіш? — паўтарыў пытанне стары.

— Я... у Цімашкі іду, — сказаў урэшце хлапчына, ухіляючыся ад адказу на пытанне старога.

— Ну, то што, калі ў Цімашкі? ... Бачыш, вунь на беразе сяло...

Непадалёк ад крыжа, каля рэчкі, рассыпаліся хаты вялікага сяла.

— ... Цімашкі яны і ёсць. Толькі нешта тоіш ад мяне, голуб...

Стары падышоў бліжэй да крыжа, моцна ўпіраючыся тоўстым кіем у зямлю. Падышоў і, як і юнак, скінуў шапку. Тады юнак ціха сказаў:

— Я хацеў спытаць, можа вы ведалі гэтых людзей, — ён паказаў рукою на крыж, — раскажыце мне пра іх.

— Ці ведаў я гэтых людзей? — горка ўсміхнуўся стары і часта заморгаў павекамі вачэй. Ці то ад ранішняга ветру, ці так ад чаго, у старога з вачэй паказалася сляза. Стары паглядзеў на ўсход. Прамені сонца паказваліся паверх лесу.

— Іх, такіх крыжоў, па свеце багата ёсць. От, стаяць дзе на ўзлеску, альбо пры дарозе, як гэты, веюць на іх ветры, палошчуць іх дажджы... і не ўбачаць пахаваныя пад імі сокалы свету яснага, вольнага нашага жыцця не ўбачаць. Эх-хе... Калі-б ты, юнача, ведаў, што за ўдалыя хлопцы былі Антон і Цярэшка, пахаваныя вось тут. Э-э, ці можна расказаць пра іх простымі словамі? Бывала, увесну Антон калі выйдзе на вуліцу, ды калі расцягне гармонік, а Цярэшка з хлопцамі калі грымнуць песню, то, ці дасі веры, хлопча, пра ўсё на свеце забудзеш, адно слухаеш іх— не наслухаешся. Калі вецер—і той сціхне, каб ямчэй па сялу разносіліся іх песні. Цярэшка быў малады, от як ты цяпер, а голас меў салаўінаму роўны — звонкі, чысты. Як заспявае ён, то ні лес, ні горы, ні долы не хочуць раставацца з голасам яго: Цярэшка ўжо і скончыў спяваць, а яны ўсё паўтараюць яго на розныя лады.

— Эх, песні, песні... Колькі іх, і сумных і вясёлых, ведаў Цярэшка-запявала, — адна другой прыгажэй, адна другой лепшая... Так і жылі хлопцы ў сяле, гаравалі, не бачачы свету яснага, як і ўсе. Але надышоў праклята час, забралі Антона на вайну, не стала гармоніка ў сяле, смутна стала ў сяле. Паехаў Антон разам з хлопцамі, сябрамі сваімі, толькі заплакаў, калі развітваўся з сялом. «Эх, — гаворыць, — ехаць едзем, а ці давядзецца вярнуцца?» А якраз вясною той ганяў ён плыты на Украіну і прывёз сабе маладую жонку Наталку з далёкага горада Канатопа. Пажыў галубок з ёю месяц, а затым і паехаў на праклятую вайну...

Праз пяць год прыходзіць Цярэшку ад Антона пісьмо: «Жыў, піша, я і здароў, на фронце кінуў вошай карміць, рэвалюцыю раблю, а ты, Цярэшка, цяпер смела пусці пеўня чырвонага ў фальварак пана Горвата. Зямлю панскую дзялі паміж беднымі». Кінуўся Цярэшка ў фальварак, а пана там ужо і след прастыў — уцёк. Жыла пан гэты быў, жыла, злосці людзі сабралі на яго, пакрышылі яны тады нямала шкла ў панскіх палацах.

Але вось вясною на пяты год прышоў у сяло і сам Антон: абшарпаны, у апорках, сухі, толькі вочы гарэлі ў яго на твары радасным агнём. Сабраў ён мужчын, выступіў на дзядзінцы, як цяпер памятаю, вінтоўку над галавой падняў... Падняў ён вінтоўку і гаворыць: «Мы рэвалюцыю,— кажа, — пераварот зрабілі, свабоды, роўнасці дабіліся, а паны і розныя белапольскія гады адабраць яе, свабоду нашу, хочуць. Касцьмі ляжам, не здадзім рэвалюцыю, прагонім з зямлі нашай ворагаў. Так, ці не, таварышы?»

У адзін голас загуў натоўп: — Яснае дзела, не здадзім!

І арганізавалі яны тут-жа партызанскі атрад. У атрад прымалі не абы каго, самых храбрых, баявых хлапцоў, бо, хлопча, адзін храбры сокал варты дзесяці слабавольных баязліўцаў.

А праз колькі часу ўвесну дваццатага года занялі сяло польскія легіянеры, а з імі прыехаў у сяло і Горват, зялёны ад злосці, скарэджаны ад бяссілля. І пачаў ён тварыць расправу над людзьмі, што свавольнічалі без яго ў палацах. Тут і паказаў сябе Антон са сваім атрадам.

Захапілі ў палон паны зямлю нашу, ды не доўга пратрымаліся. Хутка Чырвоная Армія пачала гнаць іх, сабак, адсюль, гнаць іх, нягоднікаў, назад. Разгарнуўся тут і Антон з партызанамі. Парашылі яны пана Горвата лавіць, памянуць яму здзек з безабаронных сялян. Наляцелі яны на фальварак, разагналі ахову, уварваліся ў палац. Бачаць — прыслуга панская дабро пакуе, а сам Горват з генералам нейкім пляшывым гарэлку п'е. Схапілі партызаны іх, адразу-ж забіць хацелі, ды суняў іх Антон. «Стой, — кажа, — хлопцы, яны ў нас смерць па ўсіх правілах прымуць, мы іх суду вайсковаму здадзім».

Заперлі яны Горвата з пляшывым генералам у лазні, дзе панская чэлядзь мылася, каравул з чатырох чалавек паставілі, а самі пабеглі выганяць легіянераў з вёскі.

Толькі не ўсё здарылася так, як думаў Антон. Вельмі ўжо дораг быў наймітам польскім той пляшывы генерал, захацелі яны як-небудзь выратаваць яго. А як бачылі, што сілай узяць не возьмуць, то пайшлі на хітрасць. Падляцелі надвячоркам учатырох, пераапрануўшыся, у кажушках, у будзённаўках да лазні, з коней пасаскаквалі. «Здароў, — кажуць,— таварышы. Ну, як, добра вартуеце гадаў, ворагаў пралетарскай рэвалюцыі?» Тут выступіў наперад Мікіта Цімохаў, паплечнік Антона. «Пільна вартуем, таварыш, а вы хто і чаго да нас завіталі?» «А мы, — кажуць, — з раўкома, з горада; прыехалі, каб забраць гэтых буржуеў і аддаць іх палявому суду. Хто ў вас тут старшы?». «Я старшы», — кажа Мікіта. «Чытай вось, — сказалі яму, — бумагу з раўкома». Ды тут Мікіта і сплашаў. Гонар ягоны ўсё нарабіў.

Дзед замоўк, апусціўшы ўніз галаву. Потым падняў вочы на юнака.

— Добра, калі гонар трапляе ў разумныя рукі, юнача; гора-ж калі ён даецца дурню. Не захацеў, пасаромеўся прызнацца Мікіта, што непісьменным ён быў, пакруціў, пакруціў паперу ў руках і паклаў яе запазуху. «Ну, што-ж, кажа, калі загадана здаць іх суду, то бярыце, толькі-ж пільна сцеражыце іх, бо ўцякуць яны ад вас, смерці дужа баяцца». «Будзь спакойны, таварыш, — гавораць у адказ Мікіту, — не ўцякуць яны ад нас; мы-ж на конях, ды знаем, каго вязем—гадаў».

Павялі яны шляхам, нібыта ў горад, Горвата з пляшывым генералам, а Мікіта адпусціў варту і пайшоў далажыць Антону, як і што. Як прачытаў Антон тую паперу, што Мікіта запазуху схаваў, загарэўся ўвесь ад злосці, Мікіту дурнем назваў, а сам з Цярэшкам пабег да коней. Схапіўся за галаву Мікіта, як адкрыў яму вочы Антон на хітрасць белапалякаў; ды бачыць — не час гаварыць, пераймаць трэба ўцекачоў. Выехала іх чалавек з пятнаццаць напярэймы, паскакалі па розных дарогах, толькі не тою дарогаю, што ў горад вядзе, а зусім у другі бок, бо раскусілі панскую хітрасць. Вось імчаць удвох Антон з Цярэшкам па палявой дарозе, вінтоўкі на-пагатове трымаюць; бачаць, аж каля лесу чатыры конікі скачуць. Агрэлі хлопцы гарапнікамі коней сваіх, наганяць коннікаў пачалі, да лесу даскакалі, па сцежцы лясной падымчаліся. А тыя ўцякаць хутка не могуць, бо на конях сваіх пляшывага генерала з Горватам вязуць. Даў па іх два стрэлы Антон, каня пад генералам забіў. Як забіў каня, усе яны ўшлеснёх з коней саскочылі, свіснуў адзін з іх на ўвесь лес, знак мусіць некаму падаў. А генерал хацеў схавацца, у лес кінуўся, толькі трапна страляў Цярэшка, з першага стрэлу генерала забіў. І яшчэ, і яшчэ стралялі спыніўшыся хлопцы, перапалоханага Горвата паранілі, двох салдатаў забілі. Ужо крыкнуў Антон, каб здаваліся паны, на каня хацеў ускочыць, пад'ехаць да іх, але, відаць, не лёс быў ім жывымі застацца. Выскачыў з гушчару раз'езд польскі, абкружыў Антона з Цярэшкам, ні назад, ні ўперад дарогі ім не было.

Вось так і пагінулі сокалы ясныя, партызаны храбрыя. Шалелі палякі ад злосці — гнала іх армія наша Чырвоная, без перадышак, без адпачынку гнала. І павесілі яны Антона з Цярэшкам, абаронцаў народных, на гэтай бярозе. Багата слёз у тыя гады бачылі сёлы нашы, ды столькі іх ніколі не было, як у той сумны дзень, калі загінулі Антон з сваім братам. Плакаў на гэтым узгорку народ, надрыўна галасіў. Уначы партызаны наляцелі, ушчэнт разбілі астаткі польскіх атрадаў, ды толькі не вярнуць было жыцця храбраму атаману партызанскаму, гарманісту Антону і першаму запявале Цярэшку.

А больш за ўсіх слёз праліў на гэтым узгорку я, бо гэта-ж сыны мае былі, і Антон, і Цярэшка — сыны.

Юнак уздрыгнуў.

— Вось і расказаў я табе, што за хлопцы пахаваны тут... Як загінуў Антон, сумам засумавала жонка яго Наталка. «Смутна мне, татусю, на сэрцы, — кажа мне яна, — поіду до сэбэ на Украіну». Не трымаў я яе, ведаў, як ёй цяжка было. Забрала яна сваіх двух дзетак, што прыжыла з Антонам, і паехала ў далёкі горад Канатоп, на радзіму. Старэйшага майго ўнучка Андрэйкам звалі, як сягоння помню. З той пары нічога аб ёй не ведаю, дзе яна і што. Можа, дзе і загінула з малымі сакаляткамі, а можа, і жыве...

Дзед хітра ўсміхнуўся і падняў галаву.

— Ты чаго так глядзіш на мяне, хлопча? Думаеш, не пазнаў я цябе, што ты— мой унук і прыблудзіў наведаць бацькаву магілу? Сакаліны пагляд твой, Андрэйка, напомніў мне Антона, высокі лоб і светлыя косы ў цябе, як у бацькі...

* * *

Празрыстая раніца стаяла над зямлёй. Высока свяціла сонца. Лёгкі вецер насіў над укрытымі парай палямі павуцінне «бабінага лета». Высока над галавой скігаталі жураўлі, што ляцелі ў далёкі няведамы край зімаваць.

З лесу, набраўшы поўныя кашалі грыбоў, вярталася звонкагалосая дзетвара. Шумным натоўпам абступілі дзеці дзеда, паказваючы, колькі чорнагаловых пругкіх баравічкоў удалося набраць ім.

— Дзед Рымар, а я во якога знайшоў, — крычаў самы малы з іх, сямігадовы віхрасты карапуз, трасучы над галавою грыбам.

Дзед глядзеў на дзяцей, шчасліва смяяўся і, саромеючыся, непрыкметна хаваў за бярозу свой пусты кашаль.

Потым усім кагалам яны пайшлі ў сяло, але на дарозе іх здагнаў калгасны грузавік, што ішоў з горада. Машына спынілася каля іх і з кабіны выскачыў шофер.

— Сядай, грыбавікі, у кузаў, падвязу дадому!

Дзеду Рымару ён прапанаваў месца ў кабіне, але той адмовіўся і палез разам з усімі ў кузаў.

Машына плаўна кранула з месца і паімчалася. Рэзкі вецер ударыў Андрэю ў твар.

... Яны ўязджалі ў шырокае чыстае сяло, што стаяла над ракою, і, як сцяг, над іхняй машынай трапятала песня дзетвары. Рымар трымаў Андрэя за плячо і ў захапленні паказваў рукою навокала: на новыя светлыя хаты, на вялікі новы клуб, на школу, няздўна пабудаваную, на высачэзныя скірды хлеба каля калгаснага гумна, на маладых дзяўчат, што стаялі ў веснічках варот.

— Андрэйка, унучак мой дарагі, ты глядзі, за якое жыццё ваявалі мае сыны... глядзі, — захліпаючыся ад хвалявання шаптаў стары.

... Восені, найцудоўнейшай пары года, пашанцавала быць сведкай гэтай сустрэчы дзеда з унукам на магіле іхняга сына і бацькі.

Міхалі. 1937.



ІДУЦЬ ДА ГІБЕЛІ СВАЕЙ.

Карыкатура мастака Дэні.





РУСТАВЕЛЕЎСКІЯ ДНІ Ў ТБІЛІСІ

На заключным пасяджэнні пленума Саюза Совецкіх пісьменнікаў СССР, прысвечаным 750-годдзю Шота Руставелі.

На ЗДЫМКУ: злева—народны паэт Казахстана Джамбул гутарыць з азербайджанскім паэтам-ордэнаносцам т. Самед Вургун; знізу ашуг Казахстана Кэнен Авербаеў выконвае свае вершы.

ДАЧКА РАДЗІМЫ

(Новы гукавы фільм вытворчасці Белдзяржкіно)

Тэма аб совецкіх пагранічніках з'яўляецца найцікавейшай тэмай не толькі для Белдзяржкіно, але і для ўсёй совецкай кінематаграфіі. Гэтай тэме беларуская кінастудыя прысвяціла цікавы, палітычна насычаны фільм «Дачка радзімы» (сцэнарый І. Зельцэра, рэжысёр—засл. дзеяч мастацтваў Корш-Саблін).

Карціна выключна актуальна і злабадзённа адлюстроўвае барацьбу совецкага народа з агентурай фашызма. Практыка гэтай барацьбы падказала аўтарам фільма завостра-драматычны сюжэт, пабудаваны на надзвычай тыповым факце сённяшняй класавай барацьбы з ворагамі народа. Закаранелы шпіён адной замежнай разведкі Ігнат настолькі змог усыпіць пільнасць калгаснікаў, што лічыўся ў калгасе лепшым брыгадзірам, добрым актывістам і стараннным абаронцам совецкіх граніц. Паша, старшыня калгаса, не ведала, што ў часе нямецкай акупацыі Ігнат выдаў акупантам яе бацьку — камісара партызанскага атрада. Ігнат-жа прадаўся замежнай разведцы яшчэ ў гады грамадзянскай вайны на Беларусі. З таго часу ён умела і хітра хаваў твар шпіёна пад маскай былога партызана і калгаснага актывіста. Ды і гледач спачатку схільны аддаць свае сімпатыі Ігнату. Але вось да Ігната прыходзіць шпіён Гарбацюк. Перад гледачом два шпіёны ўгаворваюцца атруціць усе студні ў раёне манеўраў часцей Чырвонай Арміі. Трывога гледача яшчэ больш узрастае, калі Паша даручае Ігнату праверыць усе студні перад пачаткам манеўраў.

Але страшэнны загавор дыверсантаў не ўдаўся. Начальнік заставы Баравы даўно падазраваў ужо Ігната ў сувязі з парушальнікамі-шпіёнамі. Пагранічнікі высачылі і злавілі ў ігнатавай хаце Гарбацюка, і цяпер Ігнат выкрыты.

Паша імчыцца на кані ў лес, дзе Ігнат з калгаснікамі стаяў у дазоры, пастаўленым Пашай, каб спаймаць Гарбацюка. Ігнат адчуў, што ён выкрыты. Са звярынай нянавісцю накідваецца Ігнат на Пашу, і пэўна загінула-б Паша ў няроўнай барацьбе, калі-б куля падаспеўшага ўчас Баравога не спыніла праджнае жыццё крываваrа здрадніка.

У гісторыі гэтай гібелі, як у кроплі вады, адлюстраваўся лёс разгромленых і сцёртых з совецкай зямлі трацкісцка-бухарынскіх банд і ўсяго фашысцкага ахвосця.

Вялікім і хвалюючым зобразам праходзіць праз усю карціну вобраз сённяшняга беларускага пагранічнага калгаса. Не глядзячы на подлую падрыўную работу ворагаў, якія імкнуліся вырваць з-пад уплыву партыі і совецкай улады беларускае калгаснае сялянства і падарваць магутнасць калгасаў, калгаснікі жывуць радасным і заможным жыццём. Цяпер, як ніколі, калгаснікі любяць сваю шчаслівую квітнеючую радзіму і разам з пагранічнікамі старанна аберагаюць свяшчэнную недатыкальнасць совецкіх рубяжоў.

Вось стары калгаснік Андрон. Ён толькі пастух, але звычка быць заўсёды на-пагатове ў прыгранічным лесе выпрацавала у ім вострае пачуццё пагранічніка. Андрон першы заўважыў прашмыгнуўшага ў кустах Гарбацюка і зараз-жа паведаміў Баравому. Андрон ведаў самыя патаемныя лясныя куткі, дзе мог неўпрыкмет праслізнуць парушальнік. Андрон вырашыў да канца прасачыць уцёкшага парушальніка і, нічога нікому не кажучы, пайшоў з ружжом у засаду. Напароўшыся на Андрона, шпіён забіў яго. Колькі гора і нянавісці да забойцы было ў слозах чэкіста Баравога на жалобным калгасным мітынгу. Увесь калгас і пагранічнікі хавалі свайго лепшага і адданага радзіме друга.

Смерць Андрона яшчэ больш мабілізуе калгаснікаў і пагранічнікаў, а разам з імі і гледачоў. Гэтая смерць, як і ўся карціна палкам, вучыць яшчэ большай пільнасці, вучыць пазнаваць ворага пад любой маскай, і ў гэтым яе вялікае выхаваўчае значэнне.

Разам з тым карціна не пазбаўлена цэлага раду недахопаў. Сцэнарысту, напрыклад, ніяк не ўдалося звязаць з сюжэтам карціны такія два вобразы, як Оля і Кося. Гэтая лірычная пара праходзіць паралельнай сюжэту лініяй. Акторы і рэжысёр засаладзілі гэтыя зобразы патачнай лірыкай і ператварылі іх у наіўны лубок. Манеўры ў карціне зусім не да месца. У пагранічнай паласе манеўры ніколі не адбываюцца.

Не ўдалося аўтарам звязаць з дзеяй і пісьмо беларускага народа вялікаму Сталіну. Эпізоды з пісьмом характарызуюць сабой толькі час і абстаноўку дзеі. І толькі непадкупная шчырасць нар. арт. СССР Блюменталь-Тамарынай у вобразе бабкі Марфы, якую калгас пасылае ў Менск вышываць пісьмо празадыру, робіць гэтыя эпізоды больш-менш натуральнымі.

Акторы Болдуман (Баравы), Жарпава (Паша), Чысцякоў (дзед Андрон) — цікава, выразна і прадумана стварылі свае зобразы. У ігры актораў Мічурына і Каваль-Самборскага адчуваецца няўпэўненасць, скаванасць, а месцамі і поўная адсутнасць зыражэння ўнутраных пачуццяў.

Карцінай «Дачка радзімы» беларуская кінематаграфія зрабіла ўдзячны пачатак распрацоўкі вельмі важнай і цікавай тэмы аб совецкіх пагранічніках. Але гэтая тэма патрабуе больш глыбокага раскрыцця і большай увагі творчых работнікаў совецкага кіно.

К. ГУБАРЭВІЧ.

Дапамагчы мастакам-самавучкам

Калі рабочыя клубы, дамы соцкультуры, профсаюзы цікавяцца работай самадзейных драматычных, харавых і балетных гурткоў, дык зусім у іншых умовах знаходзяцца мастакі-самавучкі. Пачынаючымі мастакамі ніхто не кіруе, ніхто не клапоціцца пра іх рост, працуюць яны самі па сабе, без дапамогі прафесіянальных мастакоў.

Усебеларуская мастацкая выстаўка паказала, што ў гарадах, вёсках, калгасах БССР багата талентаў. Напрыклад, гомельскі скульптар тав. Паварыч прадставіў на выстаўку творы, якія атрымалі вельмі высокую ацэнку. Тав. Дубініна вышыла карціну на пушкінскую тэму — «Ля лукамор'я дуб зялёны», якая сведчыць аб вялікіх мастацкіх здольнасцях маладой вышывальшчыцы.

Можна назваць рад вельмі добрых работ мастакоў-самавучак з розных гарадоў і вёсак БССР, якія заслугоўваюць таго, каб на іх звярнулі ўвагу. Але ні горсоветы, ні профсаюзы, ні райАНА дапамогі маладым мастакам не аказваюць. Дому народнай творчасці БССР у рабоце з мастакамі-самавучкамі не дапамагаюць, свядома тармозяць гэтую справу.

Прыкладам можа служыць арганізацыя студый выяўленчага мастацтва ў некаторых гарадах Совецкай Беларусі.

Два гады назад Саюз мастакоў адкрыў мастацкую студыю ў сталіцы БССР — Менску. Студыя працавала без плана, з перарывамі, не мела сваёй майстэрні. У лютым 1937 года быў створаны Дом народнай творчасці БССР. Саюз мастакоў адразу-ж адмовіўся ад працы са студыйцамі. На працягу ўсяго года прадстаўнікі Дома народнай творчасці абівалі парогі горсовета і іншых устаноў горада, дабіваючыся памяшкання, але дарэмна: памяшканне было знойдзена толькі нядаўна.

Трэба адзначыць, што не гледзячы на наяўнасць у Менску Дома мастака, самавучкі на працягу двух год ніякай тэарэтычнай і практычнай дапамогі ад яго не атрымоўвалі. А ўмовы ёсць.

Ёсць умовы і ў Віцебску. Але там нават не арганізавана студыя. Напрыклад, майстэрня нябожчыка мастака Пэна магла быць скарыстана для студыі, а гэтага не робіцца.

З першых дзён сваёй работы Дом народнай творчасці БССР пачаў перапіску з магілёўскім горсоветам аб адкрыцці ў Магілеве студыі. Тры разы туды выязджаў прадстаўнік Дома народнай творчасці, але з гэтага нічога не выйшла: то няма людзей, то не знайсці памяшкання. Нарэшце, знайшлі ўсё гэта—не аказалася грошай. У апошнім сваім паведамленні магілёўскі горсовет піша, што на 1938 год для мастацкай студыі будзе асігнавана 15 тысяч рублёў і студыя пачне працаваць з 1 лютага. Падрыхтоўкі-ж да гэтага ніякай не вядзецца: набор вучняў не арганізаваны, памяшканне не абсталявана, кіраўнікоў няма.

Не лепшыя справы мастацкай студыі і ў Гомелі.

К. ЦІТОЎ.

Гастролі сімфанічнага аркестра ЦДЧА

Для мастацкага абслугоўвання байцоў, каманда-начальніцкага складу і сямей ваеннаслужачага гарнізонаў БССР з Масквы прыбыў Чырвонаармейскі сімфанічны аркестр ЦДЧА імя М. В. Фрунзе, у складзе 64 музыкантаў—чырвонаармейцаў. Мастацкі кіраўнік аркестра—народны артыст СССР, ордэнаносец Л. П. Штэйнберг, дырыжор—В. Смірноў. У рэпертуары: чатыры вялікія праграмы з твораў Чайкоўскага (VI сімфонія, скрыпічны канцэрт). Рымскага-Корсакава (сеча пры Керженцы, іспанскае капрычыё, Шэхеразада), Барадзіна (палавецкія танцы), Бетховена (уверцюра «Эгмонт»), Моцарта, Ліста, Сен-Санса, Бізэ; сучасных совецкіх кампазітараў—Іпалітава-Іванава, Ракава, Дзяржынскага, Васіленка, Гліэра, Хачатурана, Дунаеўскага.

Выканаўцы сольных нумароў: скрыпка—канцэртмайстар-чырвонаармеец Баравік; спевы —салістка ЦДЧА Пяцісоцкая.

Канцэрты ў менскім гарнізоне прайшлі з вялікім поспехам.

Ул. Гл.

АБ ЛІКВІДАЦЫІ ТЭАТР[А] імя Вс. МЕЙЕРХОЛЬДА

ЗАГАД КАМІТЭТА ПА СПРАВАХ МА[С]ТАЦТВАЎ ПРЫ СОЎНАРКОМЕ СССР

Камітэт па справах мастацтваў пр[ы] Соўнаркоме СССР выдаў загад аб ліквідацыі тэатра імя Вс. Мейерхольда.

Камітэт па справах мастацтваў п[ры] Соўнаркоме СССР прызнаў, што тэ[атр] імя Мейерхольда канчаткова скаціўся [на] чужыя совецкаму мастацтву пазіцыі [і] стаў чужым для совецкага гледача.

Гэта выразілася ў тым, што:

1. Тэатр імя Мейерхольда на праця[гу] ўсяго свайго існавання не змог вызваліцца ад чужых совецкаму мастацтву, а скрозь буржуазных, фармалістычных пазіцый. У рэзультаце гэтага, ва ўгоду левацкаму трукацтву і фармалістычным выбрыкам нават класічныя творы рускай драматургіі даваліся ў тэатры ў скажоным, антымастацкім выглядзе, з скажэнем іх ідэйнай сутнасці («Рэвізор», «Г[о]ра уму», «Смерць Тарэлкіна» і інш.).

2. Тэатр імя Мейерхольда аказаўся поўным банкротам у пастаноўцы п'ес [со]вецкай драматургіі. Пастаноўка гэт[ых] п'ес давала скажонае, паклёпніц[кае] ўяўленне пра совецкую рэчаіснасць, прасякнутая двухсэнсавасцю і на[ват] прамым антысовецкім злопыхацельств[ам] («Самазабойца», «Окно в деревню», «[Ко]мандарм 2» і інш.).

3. За апошнія гады совецкія п'е[сы] зусім зніклі з рэпертуара тэатра. [Л]епшых актораў адышоў ад тэатра, а [со]вецкія драматургі адвярнуліся ад тэатр[а], ізаляваўшага сябе ад усёй грамадскаг[а] і мастацкага жыцця Саюза.

4. Да 20-годдзя Кастрычніцкай рэ[ва]люцыі тэатр імя Мейерхольда не толь[кі] не падрыхтавалі ні адной пастаноўкі, а зрабіў палітычна варожую спробу паст[а]віць п'есу Габрыловіча («Адно жыццё»), якая антысовецка скажае вядомы мастац[кі] твор Н. Астроўскага «Як гартавала[ся] сталь».

Апрача ўсяго іншага, гэта пастаноў[ка] была злоўжываннем дзяржаўнымі срод[ка]мі з боку тэатра імя Мейерхольда, пр[ы]выкшага жыць на дзяржаўныя гос[.] субсідыі.

З прычыны ўсяго гэтага, Камітэт [па] справах мастацтваў пры Соўнарко[ме] СССР пастанавіў:

а) ліквідаваць тэатр імя Мейерхольд[а] як чужы совецкаму мастацтву;

б) трупу тэатра выкарыстаць у друг[іх] тэатрах;

в) пытанне аб магчымасці далейш[ай] работы Вс. Мейерхольда ў галіне тэатр[а] абгаварыць асобна.

Гастролі маскоўскіх тэатраў у БССР

Упраўленне па справах мастацтв[аў] пры СНК БССР заключыла дагаворы [з] маскоўскім тэатрам Рэвалюцыі і маскоўск[ім] тэатрам Ленсовета на летнія гастролі [ў] гарадах БССР.

Тэатр Рэвалюцыі дасць 58 вячэрніх і 1[.] ранішніх спектакляў у Менску, Гомелі, Бабруйску. У рэпертуары: «Рамео і Джульета», «Праўда», «Лесвіца славы», «Саб[а]ка на сене», «Даходнае месца», «Два в[е]ронцы».

Тэатр Ленсовета будзе працаваць [у] Менску, Віцебску і Магілеве. Ён паказ[а] спектаклі: «Гарачае сэрца» А. Н. Астро[ў]скага, «Герман» («Пікавая дама») па [А.] С. Пушкіну, «Прафесар Палежаеў» Ра[х]манава, «Пярэнцій Іванавіч» Свірыг[.] «Слава» і «Дружба» В. Гусева, «Благ[а]часлівая Марта» Тырсо-дэ-Моліна і інш.

ПРЭМ'ЕРЫ РУССКАГА ТЕАТР[А] БССР

Гэтымі днямі Дзяржаўны рускі драма[]тычны тэатр БССР паказаў прэм'ер[у] п'есы А. Астроўскага «Шалёныя грошы» (пастаноўка засл. арт. рэсп. В. В. К[у]мельскага).

У канцы снежня Рускім тэатрам БСС[Р] паказаны спектаклі «Слава В. Гусева ў пастаноўцы Данапі і «Неспакойная старасць» Л. Рахманава ў пастаноўц[ы] Арлова.

У пачатку 1938 года тэатр мяркуе паставіць п'есу «Анна Карэніна» па Л. Н. Талстому ў інсцэніроўцы Волкава.

У СЕКЦЫІ КРЫТЫКАЎ

На пасяджэнні секцыі крытыкаў абмеркаван і зацверджан план работы секцыі на першы квартал 1938 года.

Секцыя будзе збірацца 2 разы ў месяц— 13 і 25 кожнага месяца. На сходах секцыі будзе абмеркаван рад дакладаў па пытаннях літаратуры і тэатра.

13 студзеня будуць абмеркаваны №№ 11 і 12 журнала «Полымя рэвалюцыі», 25 студзеня — даклад тав. Модэля аб юбілейных спектаклях у тэатрах БССР. 13 лютага тт. Кучар і Бярозкін зробяць даклады аб беларускай паэзіі за 1937 год. 15 лютага, у сувязі з 20 гадавінай Чырвонай Арміі, будзе заслухан даклад тав. Вольскага «Таварыш Варашылаў у беларускай паэзіі». 25 лютага адбудзецца даклад тав. Шарахоўскага аб беларускай прозе за 1937 год. 13 сакавіка—даклад тав. Юдэлевіча «Сучаснае становішча беларускай совецкай драматургіі», а 25 сакавіка— паведамленне тав. Фінкеля аб творах, надрукаваных у журнале «Штэрн» у 1937 годзе.

Усе даклады адбудуцца ў Доме совецкага пісьменніка. Разгледжаныя секцыяй работы крытыкаў будуць змяшчацца ў перыядычным друку.

Творчая нарада ў Белдзяржкіно

15 студзеня Белдзяржкіно склікае творчую нараду работнікаў кіно, літаратуры і мастацтва БССР.

На нарадзе будуць падведзены вынікі работы беларускай кінастудыі за 1937 год і абмеркаван тэматычны план студыі «Совецкая Беларусь» на 1938 год.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды». Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць раз у пяцідзённу. Адрас рэдакцыі: Менск, Савецкая 68, тэл. сакр. 25-394, рэдактара 20-831.

Уп. Галоўлітбела № 4042